

З МОТАЛЯ – У ТУРГЕНЕЎКУ

МС

ТРЭНДЫ НАДЫХОДЗЯЧАГА ГОДА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 245 (29867)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

• Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» пройдзе з 15 снежня да 15 студзеня.

• **Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — Галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі пачалася раптоўная праверка баявой гатоўнасці пад кіраўніцтвам Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзяніс ДУК, рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова:**

*«Навацыі ўступнай кампаніі не проста апраўданыя, яны наспявалі даўно. Гэтымі новаўвядзеннямі мы пераймаем найлепшае ў сусветнай практыцы ў часцы не толькі ацэнкі ведаў абітурыентаў. Так мы адкрываем дарогу таленавітым і адораным выпускнікам школ. Мы даём ім магчымасць у поўнай меры праявіць свае здольнасці. Акрамя гэтага, магчымасць паступіць у ВНУ па выніках алімпіяд дапамагае пазбавіць выпускнікоў ад дадатковага стрэсу. Бо раней ім трэба было рыхтавацца да выпускных іспытаў у школе і ўступных у ВНУ. Для яшчэ не да канца сфарміраванай псіхікі маладога чалавека гэта сур'ёзнае выпрабаванне. А цяпер дзякуючы сваім талентам і здольнасцям яны могуць быць залічаны ў вышэйшую ўстанову адукацыі яшчэ да пачатку асноўнай кампаніі. Гэта выдатны стымул для таго, каб падчас навучання ў школе старацца максімальна сябе праявіць».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Людзі павінны разумець, што мы глядзім у будучыню»

## Прэзідэнт растлумачыў, навошта патрэбен УНС

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях прывядзення асобных законаў у адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Гаворка ішла аб дапрацаваным з улікам грамадскага абмеркавання законапраекце «Аб Усебеларускім народным сходзе» і асобных палажэннях Закона «Аб палітычных партыях», якія таксама зведалі карэкціроўку.**



Фота БелТА.

Што датычыцца абмеркавання на ўзроўні кіраўніка дзяржавы гэтых найважнейшых для нашай краіны заканадаўчых актаў, то трэба адзначыць, што падобная нарада ўжо не першая. Асноўныя акцэнты па рэалізацыі нормаў абноўленай Канстытуцыі Прэзідэнтам былі неаднаразова расстаўлены і падчас іншых мерапрыемстваў. На гэты раз Аляксандра Лукашэнку, у прыватнасці, цікавіла, наколькі выканана яго даручэнне — данесці палажэнні законапраекта «Аб Усебеларускім народным сходзе» да грамадзян і даведацца аб іх меркаванні і як змяніцца заканадаўства аб партыях і грамадскіх аб'яднаннях. Былі ацэнены ўсе дапрацоўкі і ступень гатоўнасці дакументаў, якія абмяркоўваліся, для таго каб прыняць рашэнне аб іх унясенні ў Палату прадстаўнікоў.

### «УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД — СТАБІЛІЗАТАР ГРАМАДСТВА»

«Вынікі праведзенай работы — галоўнае, што хацелася б пачуць для таго, каб прыняць рашэнне на дадзеным узроўні, — звярнуў увагу беларускі лідар, гаворачы аб грамадскім абмеркаванні праекта Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе». — Як дакладваюць, публічная дыскусія праходзіла дастаткова актыўна. Я гэта назіраў. За дзесяць дзён паступіла прыкладна 500 водгукаў, гучалі розныя думкі. Ведаю, што многія прапановы, якія робяць праект лепшым і больш зразумелым, улічаны».

Прэзідэнт падкрэсліў, што перш за ўсё трэба разумець, што сход — важны канстытуцыйны прадстаўнічы орган, орган найвышэйшага народаўладдзя. «Пра тое, што УНС набудзе такі статус, гаварылася яшчэ на самым першым сходзе тым дэлегатам, якія бралі ўдзел у ім, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — ***Усебеларускі народны сход — стабілізатар грамадства. У гэтым яго галоўная роля. Стабілізаваць грамадства на ўсіх этапах яго развіцця. Калі ўзнікне неабходнасць, то менавіта на яго пляцоўцы трэба будзе дамаўляцца.*** А ў звычайных умовах сход працягне працаваць, як і склалася, толькі з пэўнымі дадатковымі функцыямі».

СТАР. 2




# НОВЫ ГОД БЕЗ ПРЫГОД

## На што звярнуць увагу, каб не сапсаваць сабе святы?

**Што ні кажы, а навагодніх свят чакаюць як дзеці, так і дарослыя. І не столькі сам дзень — ці то Новага года, ці то Раства Хрыстова — прыносіць нам доўгачаканую радасць. Асаблівы настрой з'яўляецца падчас падрыхтоўкі да свят. Аднак у перадсвяточнай мітусні і клопатах аб падарунках, прыгожых убраннях і асаблівым меню варта не забыць аб самым важным — бяспецы.**



СТАР. 3

Жыллёвая нерухомасць

# ДОБРЫ ПОПЫТ НА СТАЛІЧНЫЯ КВАТЭРЫ ЁСЦЬ...

## Росту цэн няма і не будзе?

**Адыходзячы год на сваім пачатку насуперак негатыўным чаканням пабіў рэкорды апошніх васьмі гадоў па колькасці здзелак куплі-продажу аб'ектаў жылой нерухомасці ў горадзе Мінску і, як мяркуецца, у цэлым у краіне. Нагадаем, што летась у сталіцы было прададзена больш за 14,5 тысячы кватэр, што на чвэрць больш, чым годам раней. І гэтая лічба была рэкорднай для апошняга дзесяцігоддзя.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



# «Людзі павінны разумець, што мы глядзім у будучыню»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сустракацца дэлегаты УНС цяпер будуць часцей — мінімум адзін раз на год. Механізм іх работы па-простаму, па-народнаму растлумачыў кіраўнік дзяржавы: «Сабраліся, абмеркавалі тое ці іншае найважнейшае пытанне, прынялі рашэнне і паехалі працаваць у працоўныя калектывы, паколькі гэта орган, які не пастаянна дзейнічае». Пры гэтым важна разумець, што дзейнасць дэлегатаў УНС будзе на грамадскіх пачатках — грошы ім ніхто плаціць не будзе.

У склад Усебеларускага народнага сходу ўвойдуць прадстаўнікі ўсіх слаёў беларускага грамадства. Гэта, па словах Аляксандра Лукашэнкі, галоўнае. Ён заўважыў, што некаторыя ставілі пытанне, як там будуць прадстаўлены працоўныя калектывы, казалі, што УНС будзе ледзь не чарговым сходам чыноўнікаў. «Магчыма, мы не дастукаліся да людзей, не растлумачылі ім, але прадстаўнікоў працоўных калектываў там будзе працэнтаў 90, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Толькі шляхі руху ў гэты сход крыху іншыя. Не наўпрост: сабраўся завод, вылучыў свайго прадстаўніка — і ён ва Усебеларускім народным сходзе». У новым дзяржаўным органе, па словах кіраўніка дзяржавы, будуць прадстаўлены і дэпутаты, і члены партый, грамадскіх арганізацый, і настаўнікі, і рабочыя, і сяляне, і ўрачы — а гэта і ёсць працоўныя калектывы.

Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта да дэлегатаў УНС — яны павінны быць прафесіяналамі. ***«Гэта не вясельныя генералы, якія прыехалі, пасядзелі, хто нешта зразумеў, не зразумеў, адседзеў — паехаў, — такіх там быць не павінна, — перакананы беларускі лідар. — Гэта, як я ўжо сказаў, павінны быць прафесіяналы, людзі дасведчаныя, з багатым вопытам за плячыма. Ім трэба будзе прымаць рашэнні па стратэгічных напрамках, найважнейшых пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця.*** Такая адказная місія нашага сходу. Мы ўсё павінны зрабіць так, каб дэлегаты (іх жа няшмат: з 10 мільёнаў прыкладна 1200 чалавек), вярнуўшыся на свае рабочыя месцы, зрабілі справаздачу перад працоўнымі калектывамі па тых пытаннях, якія разглядаліся на Усебеларускім народным сходзе».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, нягледзячы на тое, што ў складзе УНС будуць паважаныя людзі, сход не можа ўмешвацца ў дзейнасць іншых органаў, падмяняць іх, выконваць іх функцыі. ***«Усебеларускі народны сход, па сутнасці, павінен захавацца як палітычны інстытут, а не перарасці ў нейкі бюракратычны орган»,*** — падкрэсліў ён.

### «ГАЛОЎНАЕ — НАША КРАІНА, НАШ ВОПЫТ»

Спыніўся кіраўнік дзяржавы і на яшчэ адным значным інстытуце для нашага грамадства — на палітычных партыях. Праект, які прадугледжвае карэкціроўку адпаведнага закона, таксама раней ужо абмяркоўваўся і разглядаўся на нарадзе ў Прэзідэнта. Дакумент быў дапрацаваны. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пажадаў пачуць пра яго галоўныя, асноўныя навацыі.

Што змянілася, як будзем арыентавацца — таксама важныя пытанні, якія, па яго словах, могуць выклікаць у грамадстве не толькі дыскусіі, але і супрацьстаянне. «Я гэта ведаю са свайго вопыту, ды і ўсе мы гэта праходзілі ў нашым грамадстве, — нагадаў беларускі лідар. — Таму ўсё трэба загадзя адрэгуляваць у законе, давесці да людзей, каб гэта не абурала членаў партыі і не выклікала турбулентнасць нашага грамадства. ***Дакумент павінен адпавядаць беларускім рэаліям і ісці ад жыцця. Так, мы павінны бачыць, што адбываецца на знешнім контуры, за межамі нашай краіны, але галоўнае — наша краіна, наш вопыт. Мы толькі гэтаму павінны адпавядаць — жыццю нашых беларусаў і нашага грамадства».***

Прэзідэнт яшчэ раз звярнуў увагу на тое, што на палітычным полі краіны павінны працаваць толькі тыя партыі, дзейнасць якіх адпавядае асноўным прынцыпам унутранай і знешняй палітыкі. «Але калі на Усебеларускім народным сходзе, дзе будуць прадстаўнікі партый і гэтак далей, выпрацоўваць стратэгію, то гэтай стратэгіі палітычныя партыі павінны і прытрымлівацца, — удакладніў ён. — Што тут незразумелага і што тут няправільнага? Курс ёсць, ён выпрацаваны — калі ласка, давайце рэалізоўваць. Шляхі могуць быць розныя. Таму ў палітычных партый ёсць дастаткова люфтаў для таго, каб прапанаваць тыя ці іншыя шляхі. Напрыклад, камуністы гэта будуць бачыць больш радыкальна, з «левых» пазіцый. Яны больш заточаныя на дзяржаўную ўласнасць, на планавую эканоміку. Цяпер курс кампартыі крыху змяніўся ў правы бок. Нейкая цэнтрысцкая партыя будзе, больш ліберальная, можа, і радыкальна-ліберальная, але адданая ідэям стратэгічнага курсу, будзе і «правая» партыя».

У гэтым Прэзідэнт нічога дрэннага не бачыць. Яго галоўнае патрабаванне — абавязкам любой партыі павінна быць адданасць краіне. Адпаведна, дзейнічаць яна павінна ад імя грамадзян, насельніцтва Беларусі.

«Вядома, палітычная сістэма будзе развівацца, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — Упэўнены, з'явяцца новыя патрыятычна настроеныя партыі. Адначасова адбудзецца ачыстка ад «выпадковых спадарожнікаў». Разам з тым, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе змены не будуць адбывацца ў адзін момант. Для гэтага спатрэбіцца час, але пачынаць, па яго словах, трэба ўжо цяпер.

### УНС БУДЗЕ ВЫРАШАЦЬ ГЛАБАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

Заслухоўваючы даклады адказных асоб, якія падрабязна расказалі аб навацыях заканадаўства, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў грамадстве ёсць невялікі працэнт тых, хто лічыць, што такі орган, як Усебеларускі народны сход, не патрэбны. Тым, хто гэтак лічыць, адказ Прэзідэнта такі: «Людзі павінны разумець, што спакойна ўжо не будзе. Нам спакойнага жыцця не дадуць, нават калі мы, увесь наш народ, будзем таго хацець. Ну а раптам здарыцца неразбярыха? 2020 год — гэта была спроба знешняга мяцяжу, знешняга ўздзеяння на краіну. Гэта галоўнае. Ну і ўнутры знайшлося некалькі тысяч чалавек, якія паддаліся гэтаму. Але калі ўнутранае супрацьстаянне? Так, яно будзе падагравацца звонку, але галоўная прычына і галоўныя дзейсныя сілы будуць унутры? У нас гэтага не было, але такое можа быць. Асабліва цяпер, калі мяняецца пакаленне, калі, натуральна, будзе мяняцца ўлада, у тым ліку і Прэзідэнт. ***Калі з'явяцца такія прычыны для сутыкнення, унутраныя прычыны, мы што лоб у лоб, сценка на сценку, праспект Незалежнасці на праспект Пераможцаў пойдзем адзін на аднаго? Гэтага быць не павінна. Вось мы і прапаноўваем народу і дзяржаве гэты механізм — Усебеларускі народны сход».***

Гэта, па яго словах, павінны разумець усе беларусы. У выпадку сур'ёзных канфліктаў вырашэнне сітуацыі, прыняцце адпаведнага рашэння ўскладзена на Усебеларускі народны сход. «Нашы людзі з грамадзянскай вайной і грамадзянскім супрацьстаяннем не сутыкаліся, — заўважыў Прэзідэнт. — Таму многія кажуць пра УНС: «Ну і навошта гэта? Можа, і не трэба?» Дай Бог, каб у дадзеным выпадку не трэба было, але ўсялякае ў жыцці можа быць. Гэта ж амаль нічога не каштуе дзяржаве. 1200 чалавек, якія працуюць на месцы. Прыехалі — паставілі кропку ў супрацьстаянні. ***Людзі павінны разумець, што мы глядзім у будучыню. Дай Бог, каб таго супрацьстаяння не было. Але калі будзе, мы вырашым яго на гэтым народным вечы».***

Кожны грамадзянін Беларусі павінен разумець, што Усебеларускі народны сход — яго прадстаўнічы орган. І калі спатрэбіцца, то там вырашацца галоўнае пытанне. Акрамя таго, на думку Аляксандра Лукашэнкі, людзям патрэбна паясніць і тое, што не трэба бегчы ва Усебеларускі народны сход і загружаць яго пытаннямі будаўніцтва дамоў, платоў, дахаў. Гэта не тыя задачы, якімі павінен займацца новы дзяржаўны орган. «Будуць прапісаны выключныя, глабальныя пытанні, якія павінны вырашацца ў нашай краіне, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, гаворачы аб функцыях УНС. — Гэта стратэгія, як будзем жыць далей, як будзем развівацца».

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

### Святлана ЛЮБЕЦКАЯ: «УНС — ОРГАН, ЯКІ НАДЗЕЛЕНЫ ВЫКЛЮЧНЫМІ ПАЎНАМОЦТВАМІ»

У размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ** расказала аб выніках грамадскага абмеркавання праекта Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе», аб рэалізацыі некаторых яго палажэнняў. «Вопыт правядзення грамадскіх абмеркаванняў сёння дае дастаткова важную глебу для разважанняў, — адзначыла парламентарый. — Вельмі цікавая інфармацыя паступала ў ходзе абмеркавання законапраекта. Частка прапаноў, відавочна, выходзіла за межы Канстытуцыі або ёй супярэчыла, таму гэтыя прапановы былі адхілены. Частка прапаноў (і іх вельмі шмат) будзе рэалізавана на ўзроўні рэгламенту УНС. Выказваліся больш дэталізаваныя меркаванні, ідэі, як будзе працаваць Усебеларускі народны сход».

У закон увойдуць абгрунтаваныя прапановы, якія змяшчаюць канструктыўныя ідэі, прычым канцэптуальнага характару. «І для грамадскага ўспрымання, і для правапрымянення яны былі ўлічаны, — удакладніла Святлана Любецкая. — У прыватнасці, гэта датычыцца асноўнай ідэі, фармату УНС. Гэта орган, надзелены выключнымі паўнамоцтвамі. Рашэнні, якія будзе прымаць УНС, — таксама рашэнні выключнага характару. Іх не павінна быць шмат і масавых, па дробных пытаннях».

Галоўная роля і задача Усебеларускага народнага сходу, па словах старшыні камісіі, — вызначаць стратэгічныя напрамкі сацыяльнага развіцця. «У выпадках неабходнасці, у выключных выпадках ён павінен уключыцца як страхавачны механізм, як орган грамадскай згоды, — заўважыла дэпутат. — Калі ёсць нейкае спрэчнае пытанне або канфлікт па той ці іншай сітуацыі, хто павінен выслухаць усіх, абмеркаваць і прапанаваць разумнае, кансэнсуснае рашэнне? Сёння дзяржава прапануе такі інстытут у асобе УНС».

З улікам заўваг і прапаноў грамадзян праект закона ў некалькіх артыкулах быў дапоўнены ўдакладненнем аб ролі і месцы Усебеларускага народнага сходу, а таксама аб значэнні яго рашэнняў менавіта ў частцы выключнай кампетэнцыі гэтага інстытута. Асобны блок заўваг і прапаноў датычыўся парадку фарміравання Усебеларускага народнага сходу. «Адметна, што ідэі і падыходы былі сугучныя ў розных катэгорый грамадзян, — падкрэсліла Святлана Любецкая. — У абмеркаванне ўключыліся як прадстаўнікі юрыдычнай, прафесійнай, навуковай супольнасці, так і маладзёжнага студэнцтва, грамадзяне з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Лейтматывам служыла думка аб тым, што мы хочам бачыць у складзе Усебеларускага народнага сходу прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў і груп грамадства, каб гэта былі не толькі кіраўнікі, але і настаўнікі, і рабочыя, прадстаўнікі навуковай супольнасці, рознаўзроставыя людзі. Такі падыход быў улічаны, успрыняты і на ўзроўні закона замацаваны для таго, каб гэта была аксіёма, якая будзе прымяняцца пры праходжанні працэдуры фарміравання УНС».

Цікавіў грамадзян і парадак работы Усебеларускага народнага сходу па пэўных працэдурах. У ходзе грамадскага абмеркавання высветлілася, што не зусім было зразумела шырокаму колу, як будзе фарміравацца пазіцыя УНС па тых ці іншых пытаннях, як будуць вызначацца пытанні, што падлягаюць разгляду на сходзе.

Грамадства хвалявала і тое, хто будзе кандыдатамі ў дэлегаты УНС. Прапаноўвалася, каб людзі, якія будуць прымаць рашэнні, адпавядалі высокаму статусу, каб гэта былі адказныя грамадзяне з адпаведнымі кампетэнцыямі.

«Дапрацоўка законапраекта на гэты час з улікам канцэптуальных ідэй, падыходаў, палажэнняў праведзена, — рэзюмавала Святлана Любецкая. — Законапраект падрыхтаваны да ўнясення ў Палату прадстаўнікоў і ў далейшым таксама будзе праходзіць прапрацоўку і падрыхтоўку да першага і другога чытання, што ўстаноўлена нашым заканадаўствам адносна нарматворчасці».

### Сяргей ХАМЕНКА: «НІЯКІХ СКЛАДАНАСЦЯЎ ДЛЯ ТАГО, КАБ СТВАРЫЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ ПАРТЫЮ, СЁННЯ НЕ ІСНУЕ»

Як адзначыў у размове з прадстаўнікамі **мас-медыя міністр юстыцыі Сяргей ХАМЕНКА,** пытанні партыйнага будаўніцтва шчыльна звязаны з развіццём грамадства. «Кіраўніком дзяржавы заслуханы прапановы, выпрацаваныя на ўзроўні экспертаў, спецыялістаў з прыцягненнем кіраўнікоў дзеючых партый і грамадскіх аб'яднанняў, — удакладніў ён. — У дакладзе кіраўніку дзяржавы акцэнтавана ўвага менавіта на рэалізацыі цяперашніх жыццёвых рэалій. Гэта пашырэнне сферы ініцыятывы і магчымасць праявіць актыўную жыццёвую пазіцыю ўсім грамадзянам Рэспублікі Беларусь. Тым, хто сапраўды хвалюецца за будучыню краіны, тым, хто разумее, што ад стабільнасці і сацыяльна-эканамічнага развіцця залежыць будучыня нашых дзяцей».

Перарэгістрацыю, у адпаведнасці з новым заканадаўствам, змогуць атрымаць не толькі партыі, якія існуюць на цяперашні момант. «Больш верагодныя варыянты, калі з актыўных грамадскіх аб'яднанняў, такіх як «Белая Русь», Беларускі саюз жанчын, пры наяўнасці ініцыятывы кіраўніцтва і шараговых членаў будуць створаны новыя партыі, — звярнуў увагу міністр. — Тут, калі гаварыць глабальна, дадзена поўная ініцыятыва для таго, каб удзельнічаць у палітычным жыцці нашага грамадства».

Сяргей Хаменка расказаў, што на выпадак з'яўлення сіл, якія выступяць з ініцыятывай стварэння партыі, у праекце закона максімальна даступна выкладзены парадак стварэння і рэгістрацыі палітычнай партыі. «Ніякіх складанасцяў для таго, каб стварыць палітычную партыю, сёння не існуе, — падкрэсліў ён. — Адзінымі ўмовамі, якія агавораны, з'яўляюцца падтрымка развіцця канстытуцыйнага ладу нашай дзяржавы, недапушчэнне фінансавання з боку замежных крыніц, недапушчэнне прапаганды тэрарызму, экстрэмізму і іншых негатыўных праяў».

## СЯРГЕЙ АЛЕЙНІК НАЗНАЧАНЫ МІНІСТРАМ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зрабіў кадравыя назначэнні ў кіраўніцтве Міністэрства замежных спраў і Узброеных Сіл, перадае БелТА.**

Міністрам замежных спраў Беларусі назначаны Сяргей Алейнік, які да гэтага часу працаваў у знешнепалітычным ведамстве на пасадзе першага намесніка міністра.

Андрэй Лук'яновіч назначаны камандуючым Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Раней ён займаў пасаду намесніка камандуючага ВПС і войскамі ППА — начальніка авіяцыі.

«Ну як не публічна можна такіх людзей назначаць? Таму я вас запрасіў для таго, каб сапраўды так было, як гэта прынята ў нашай дзяржаве», — сказаў Прэзідэнт, вітаючы Сяргея Алейніка і Андрэя Лук'яновіча.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што напярэдадні абмеркаваў з імі ўсе нюансы іх будучай дзейнасці на новых пасадах. У прысутнасці цяпер ужо новага міністра і камандуючага ён падпісаў указы аб іх назначэнні.

Сяргей Алейнік падзякаваў кіраўніку дзяржавы за высокі давер. «Нялёгка будзе», — заўважыў беларускі лідар.

Андрэй Лук'яновіч адказаў па-вайсковаму: «Служу Рэспубліцы Беларусь, таварыш Галоўнакамандуючы!» «Таксама няпростая сітуацыя (у сферы адказнасці камандуючага. — **Заўв. БелТА**)», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён яшчэ раз павіншаваў абодвух з назначэннем і пажадаў ім поспехаў на новых пасадах.

# НОВЫ ГОД БЕЗ ПРЫГОД

## ЁЛАЧНАЯ ГІРЛЯНДА: ПРЫГОЖА, АЛЕ НЕБЯСПЕЧНА

Увага галоўнаму атрыбуту навагодніх свят — ёлцы. На жаль, аб тым, што яна можа стаць прычынай пажару, ведаюць не ўсе. Любыя гірлянды, якія мы вешаем на жывую ялінку або штучную прыгажуню, пажаранебяспечныя. Таму, каб знізіць рызыку ўзгарання, неабходна выключаць іх на ноч і пры выхадзе з дому. Па гэтай жа прычыне не рэкамендуецца размяшчаць ёлку каля прыбораў ацяплення, батарэй, электрычных абагравальнікаў. Штучныя ялінкі ўспыхваюць вельмі хутка, таму справіцца з пажарам будзе няпроста. Невыпадкова падчас упрыгожвання ёлкі не рэкамендуецца выкарыстоўваць вату і свечкі, устанаўліваць галоўны атрыбут свята на дыване.

Як паказвае практыка, пажары часцей за ўсё ўзнікаюць з-за праблем са старымі або самаробнымі гірляндамі. Таму, перад тым як павесіць іх на ёлку або акно, паклапаціцеся аб спраўнасці сваіх «агеньчыкаў». Калі ж іх у вас пакуль няма, набывайце гэты навагодні дэкор у спецыялізаваных крамах, дзе падобны тавар заўсёды сертыфікаваны.

Узгарання пазбегнуць не ўдалося? У першую чаргу выцягніце гірлянду з электрасеткі. Затым перакуліце ёлку на падлогу і накрыйце яе шчыльнай коўдрай, пледам або дыванам. У гэтым выпадку можа спатрэбіцца парашковы вогнетушыцель, калі такі ёсць у наяўнасці. І толькі тады, калі самастойна справіцца з пажарам не атрымалася, патэлефануйце па нумары 101 або 112, пакіньце памяшканне і зачыніце дзверы.

## У КЛОПАЦЕ ПРА СВЯТОЧНЫ СТОЛ

Святочнае меню — асаблівы пункт у спісе перадначавагодніх спраў. Як правіла, прыгатаванне ежы займае нямала часу ў гаспадынь, якія жадаюць парадаваць сваіх родных і гасцей нечым смачненькім. Пры гэтым ад кухонных спраў гаспадыня вымушана адцягваць увагу на іншыя перадсвяточныя клопаты: упрыгажэнне кватэры, убранне ёлкі, падрыхтоўку падарункаў, прасаванне сукенак і кашуль... Нярэдка гаспадыні, якія гатуюць святочныя стравы, любяць выскачыць у краму па гарошак або іншы інгрэдыент, якога не хапае. Пры гэтым не выключыўшы пліту, з якой, на іх погляд, нічога не здарыцца. Аднак хоць бы ўлічваючы такі аб'ектыўны фактар, як вялізныя чэргі ў гэты час у крамах, лепш не рызыкаваць. Ды мала што можа здарыцца па дарозе па гарошак? Паслізнуўся, загаварыўся, заглядзеўся...

Небяспеку нясуць і бенгальскія агні, якія мы любім запальваць як за святочным сталом, так і не толькі за ім. Не раз былі выпадкі, калі ад невялічкай іскрынкі з бенгальскага агеньчыка загараліся і сурвэткі, і прадметы адзення, і нават прадметы мэблі. Таму не страчвайце пільнасць падчас запальвання бенгальскіх агнёў. Калі яны адгарэлі, не кладзіце іх ні на сурвэтку, ні на абрус — найлепш апусціце ў ваду.

## СВЯТЫ НЕ НАГОДА СТРАЧВАЦЬ ПІЛЬНАСЦЬ

Ратавальнікі заўважаюць, што большасць пажараў адбываецца тады, калі людзі знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення. Часта трагедыі здараюцца і з-за таго, што грамадзяне кураць у памяшканні. Новы год і Каляды — не нагода расслабляцца да такой ступені, што можна забыць пра ўсё на свеце, у тым ліку пра ўласную бяспеку.

На жаль, гэта апошняе, пра што 1 студзеня мінулага года думалі жыхары адной з кватэр у Дзяржынску. Ратавальнікі, якія прыбылі на паведамленне аб пажары, устанавілі, што ўзгаранне адбылося ў кватэры на першым паверсе. Дым хутка распаўсюдзіўся па лесвічнай клетцы на іншыя паверхі пяціпавярховага дома. Правёўшы разведку ў кватэры, дзе адбылося ўзгаранне, супрацоўнікі МНС знайшлі жанчыну. Яе вынеслі на вуліцу і перадалі медыкам. Дапамога спатрэбілася і жыхарам іншых кватэр. У прыватнасці, на лесвічнай клетцы паміж чацвёртым і пятым паверхамі ратавальнікі знайшлі траіх маладых людзей, якія самастойна пакінуць пад'езд не змаглі. Гаспадару кватэры, дзе адбылася трагедыя, дапамога ўжо не спатрэбілася — ратавальнікі знайшлі яго без прыкмет жыцця. Маёмасць была моцна пашкоджана. Без даху над галавой за некалькі гадзін да Новага года летась аказалася і гаспадыня аднаго з дамоў у аграгарадку Браткова Капыльскага раёна. Ратавальнікі, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, паспяхова справіліся з вогненнай стыхіяй. Гаспадыні іх дапамога не спатрэбілася — яшчэ да прыбыцця пажарных жанчыну выратавалі суседзі.

— Колькасць пажараў у дні навагодніх і калядных свят павялічваецца больш чым на 20 % у параўнанні са звычайнымі днямі, — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Пік пажараў прыпадае на навагоднюю і калядную ночы. У перыяд з 25 снежня да 7 студзеня мінулага года адбылося 296 пажараў, у выніку якіх загінулі 52 чалавекі, яшчэ 19 былі траўміраваны. У тым ліку ў навагоднюю і калядную ночы адбыліся 62 пажары, ад якіх загінулі 14 чалавек. Прычынай большасці пажараў з'яўляецца чалавечы фактар.

Невыпадкова, каб яшчэ раз нагадаць насельніцтву аб правілах бяспечнай жыццядзейнасці, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях традыцыйна праводзіць акцыю «Бяспечны Новы год». Сёлета яна складаецца з трох этапаў. Падчас першага, з 12 да 16 снежня, мэтавая аўдыторыя ратавальнікаў — асобы пажылога ўзросту. Прапагандысты МНС наведваюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дамы ветэранаў і інвалідаў, санаторыі, дзе адпачывае гэтая катэгорыя насельніцтва. Пажылых людзей чакаюць не толькі прафілактычныя мерапрыемствы, але і багатая культурная праграма. З 19 да 23 снежня, падчас другога этапу акцыі, ратавальнікі прынясуць свята ў школы, інтэрнаты, сем'і, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, у дзіцячыя дамы і дамы сямейнага тыпу. У госці да дзяцей прыедуць Дзед Мароз, Снягурка, а таксама героі мультфільма МНС «Чароўная кніга» і «Спецатрад 112», якія разам з ратавальнікамі раскажуць аб правілах бяспекі ў перыяд зімовых канікул. У прыватнасці, хлопчыкі і дзяўчынкі даведаюцца, як паводзіць сябе на лёдзе, як карыстацца піратэхнікай, хлапушкамі і бенгальскімі агнямі. У фінальным этапе акцыі, з 26 да 30 снежня, у месцы продажу піратэхнікі прыйдуць пажарны Дзед Мароз, Снягурачка, казачныя персанажы, якія правядуць з пакупнікамі адпаведныя гутаркі, раздадуць інструкцыі па бяспечным выкарыстанні піратэхнікі, памятныя календары акцыі і наглядна-выяўленчую прадукцыю.

## ЯРКАЯ КАРЦІНКА МОЖА ДОРАГА КАШТАВАЦЬ

Без запуску феерверку не абыходзіцца ні адзін Новы год. Прычым стварыць сабе і навакольным маляўнічае шоу сёння можа дазволіць практычна кожная сям'я. Аднак перш чым запусціць салют, варта прадугледзець усе моманты бяспекі. Перш-наперш, як і ў выпадку з гірляндай, падчас выбару піратэхнікі варта выкарыстоўваць сертыфікаваную прадукцыю.

— Ні ў якім разе не набывайце піратэхнічныя вырабы з рук, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Агледзьце скрыню, яе цэласнасць не павінна быць парушана. Перш чым прыступіць да выкарыстання піратэхнічнага вырабу, уважліва вывучце інструкцыю. Калі ж феерверк не спрацаваў, дзейнічайце па інструкцыі. Ні ў якім разе не падбягайце адразу да прылады, не спрабуйце прывесці яе паўторна ў дзеянне, не разбірайце і не спрабуйце яе дапрацаваць. Пры адсутнасці частак, якія тлеюць, варта пакласці скрынку ў ваду як мінімум на 24 гадзіны, пасля чаго ўтылізаваць з бытавым смеццем. Ні ў якім разе нельга спальваць піратэхніку на вогнішчы!

Ратавальнікі нагадваюць: запускаць піратэхнічныя вырабы могуць дзеці, старэйшыя за 16 гадоў, і тое ў прысутнасці дарослых. Набываючы піратэхнічны сродак, варта разумець, што гэта прадмет павышанай небяспекі. І чалавек, які прыводзіць яго ў дзеянне, нясе адказнасць не толькі за ўласныя здароўе і жыццё, але і за тых, хто побач. Бацькі абавязкова павінны патлумачыць сваім дзецям, да чаго можа прывесці самастойны запуск піратэхнікі. Узрываць феерверкі і петарды можна толькі ў бязлюдных і бяспечных месцах. У грамадскіх месцах гэта катэгарычна забаронена, як і закідваць іх у вокны, балконы і капюшоны таварышаў. Для запуску піратэхнікі неабходна адысці на ўказаную ў інструкцыі бяспечную адлегласць ад выпадковых мінакоў, будынкаў, збудаванняў і аўтамабіляў.

## АСЦЯРОЖНА, ЦЮБІНГ!

Навагоднія святы традыцыйна супадаюць са школьнымі канікуламі. У гэтай святочнай мітусні вельмі важна трымаць на кантролі дзяцей. Самае галоўнае правіла — не пакідаць іх адных. Як правіла, у небяспечныя сітуацыі дзеці трапляюць менавіта тады, калі застаюцца сам-насам.

У гэтай сувязі не будзе лішнім нагадаць аб правілах бяспекі падчас катання з горак. Асабліва асцярожнымі трэба быць з цюбінгамі. Аднак не варта заспакойвацца і тады, калі ваша дзіця катаецца на лядзянцы або санках — і ў гэтых сродках для катання ёсць «слабыя» месцы, з-за якіх нескладана атрымаць траўму на роўным месцы. Медыцынскія супрацоўнікі б'юць трывогу: рэгулярна ва ўстановы аховы здароўя паступаюць траўміраваныя падчас такога баўлення часу дзеці.



Вядома, без актыўнага катання цяжка ўявіць зіму. Аднак каб такі адпачынак быў не толькі прыемны, але яшчэ і небяспечны, ратавальнікі рэкамендуюць уважліва ставіцца да выбару горкі і сродкаў для катання. З малымі дзецьмі ўвогуле не варта хадзіць на горку з крутымі схіламі і трамплінамі. Адпускаць туды дзяцей адных катэгарычна забараняецца!

Як звярнулі ўвагу ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, калі вы ўжо прыйшлі з дзецьмі на горку, перш пракаціцеся з яе самі — выпрабуйце на сабе, наколькі небяспечны спуск. Абавязкова назірайце за тым, як катаецца з горкі ваша дзіця. Лепш за ўсё, калі нехта з дарослых сочыць за спускам зверху, а нехта знізу дапамагае дзецям вызваляць шлях. Ні ў якім разе не выкарыстоўвайце ў якасці горак чыгуначныя насыпы і горкі паблізу праезнай часткі дарог. Не варта выбіраць для катання і тую горку, якую перакрываюць дрэвы, кусты, слупы вулічнага асвятлення або платы. І яшчэ вельмі важны момант: калі вы ўжо дазволілі дзіцяці праводзіць час менавіта такім чынам, то навучыце яго правільна падаць: павярнуцца на бок, сагнуўшы і падціснуўшы калені. Гэтыя нескладаныя правілы дазволяць засцерагчы вас і вашых дзяцей ад магчымага траўміравання.

**Веранiка КАНЮТА.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Bloomberg: Расія зноў можа стаць асноўным пастаўшчыком газу ў краіны Еўропы



**З пачатку канфлікту ва Украіне экспарт расійскага газу па трубаправодах у краіны Еўропы істотна знізіўся. Тым не менш у будучыні Расія можа вярнуць сабе пазіцыі асноўнага пастаўшчыка блакітнага паліва ў краіны еўрапейскага кантынента, піша Bloomberg.**

Да пачатку канфлікту ва Украіне Расія пастаўляла краінам Еўропы прыкладна 40 % спажыванага імі газу. «Энергетычны мост, які існаваў дзесяцігоддзямі, вытрымаў самыя цяжкія перыяды халоднай вайны, распад Савецкага Саюза і лібералізацыю еўрапейскіх энергетычных рынкаў», — адзначае Bloomberg.

Аднак усё змянілася ў лютым гэтага года. Еўропа па-ранейшаму купляе вялікія аб'ёмы расійскага звадкаванага прыроднага газу, але транзіт па трубаправодах скараціўся. Чакаецца, што доля расійскага газу ў еўрапейскім балансе знізіцца ў 2023 годзе да 10 працэнтаў.

Агенцтва адзначае, што многія еўрапейскія лідары сёння гавораць аб тым, што іх краіны не вернуцца да ранейшых адносін з Расіяй пасля заканчэння ўкраінскага канфлікту. Аднак рынкавыя рэаліі і геаграфічны фактар могуць змяніць пазіцыі нават самых рашучых палітыкаў Захаду, бо на карту пастаўлены мільярды долараў.

### Пуцін даручыў ураду папулярызаваць герояў расійскай гісторыі і фальклору

**Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін даручыў кабміну прыняць меры для папулярызацыі герояў расійскай гісторыі і расійскага фальклору, прапануецца ў тым ліку выкарыстоўваць іх выявы на сувенірах. Пра гэта паведамляецца на сайце Крамля.**

«Прыняць меры, якія будуць накіраваны на папулярызацыю герояў расійскай гісторыі і фальклору, якія адпавядаюць традыцыйным каштоўнасцям, уключаючы выкарыстанне малюнкаў гэтых герояў пры вытворчасці выяўленчай, друкаванай, сувенірнай і іншай тыражаванай прадукцыі і тавараў народнага спажывання», — зазначаецца ў даручэнні кіраўніка расійскай дзяржавы.

Тэрмін выканання — 15 мая 2023 года. Адказным быў прызначаны кіраўнік урада Міхаіл Мішусцін.

### Дзярждэп заклікаў Вільнюс прызнаць датычнасць літоўскіх герояў да Халакосту

**Улады Літвы павінны прызнаць, што шэраг «нацыянальных герояў» удзельнічалі падчас Другой сусветнай вайны ў арганізаваным нацыстамі масавым знішчэнні яўрэяў. Аб гэтым заявіла спецыяльны прадстаўнік Дзярждэпартамента ЗША па пытаннях Халакосту Элен Джэрмэйн, паведамляе ТАСС са спасылкай на літоўскае агенцтва ELTA.**

«Усхваляюцца, увекавечваюцца помнікамі людзі, якія бачацца як нацыянальныя героі, таму што яны змагаліся супраць Саветаў, але адначасова яны былі і нацысцкімі калабарацыяністамі, удзельнічалі ў злачынствах нацызму, у генацыдзе», — сказала яна. Элен Джэрмэйн заклікала ўлады Літвы называць рэчы сваімі імёнамі. У прыклад яна прывяла ўдзельніка «Літоўскага фронту актывістаў» Ёнаса Нарэйку, які быў пры нацыстах начальнікам Шаўляйскага павета і загадаў перасяліць яўрэяў у гета, а таксама Юозаса Крыкштапоніса, чый атрад удзельнічаў у забойствах яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі. У Літве Нарэйку і Крыкштапоніса лічаць нацыянальнымі героямі.

# ДОБРЫ ПОПЫТ НА СТАЛІЧНЫЯ КВАТЭРЫ ЁСЦЬ...



## У крызіс усё прывідна, толькі жыллё рэальнае

Першапачаткова ніхто з аналітыкаў і рыелтараў не чакаў чагосьці асаблівага ад гэтага года, які хай і пачаўся вельмі актыўна, але без ажыятажу. Нагадаем: у студзені было 960 прададзеных кватэр, што даволі нядрэнна для першага месяца года. Але ў лютым на рынку пачалася блытаніна, потым — рост курсаў валют, адмененыя здзелкі і чакальная паўза ў вырашэнні кватэрнага пытання.

Здавалася б, час для сур'ёзных пакупак непадыходзячы, а сітуацыя ва ўсім — непрадказальная. Насуперак усім прагнозам, практычна адразу са стабілізацыяй курса долара рынак нерухомасці не замёр, а ад месяца да месяца станавіўся ўсё больш ажыўленым. Спецыялісты тлумачаць такі парадокс проста. Шмат у чым справа ў псіхалогіі: пакупніцкі попыт падштурхнула спалучэнне негатыўных і пазітыўных фактараў.

Што стала прычынай небывалага попыту ў самы разгар крызісу, тлумачыць **намеснік начальніка аддзела кансалтынгу і аналітыкі найбуйнейшага агенцтва нерухомасці Андрэй ЧАРНЫШОЎ.** На яго думку, 2022 год ужо стаў рэкордным і б'е папярэдні паказчык, чаго ніхто не чакаў. Наадварот, нават меркавалася нейкая прасадка попыту пасля некалькіх вельмі ажыўленых гадоў для рынку нерухомасці. І наогул якіх-небудзь перадумоў, якія паказвалі на тое, што такое ажыўленне адбудзецца, не было.

Каб растлумачыць рэальны механізм сёлетняга рэкорду, неабходна вярнуцца трохі назад. З 2016 года на фоне патаннелых у два разы крэдытаў попыт на нерухомасць расце, а разам з ім і цэны. «Калі мы вернемся ў 2020 год, то, можна сказаць, у нейкім сэнсе ён вывеў усіх з зоны камфорту. Бо да гэтага некалькі гадоў усё было вельмі стабільна, калі даходы раслі, напалову зніжаліся стаўкі па крэдытах (з 36 % да 15 %), долар стабільны, усё добра і даступна», — нагадвае Андрэй Чарнышоў.

Сітуацыю змяняе 2020 год, які пачаўся з каранавіруса, затым назіралася павышэнне на 25 % курса долара (упершыню за некалькі гадоў). Аўтаматычна з павелічэннем абменнага курса долара ў пераводзе на беларускія рублі даражэе і нерухомасць (а гэта сур'ёзна закранула тых, хто купляў кватэру ў крэдыт). Аднак на фоне пандэмічных страхаў рост курса валют прайшоў практычна незаўважаным. А вось тое, што многія банкі альбо прыпынілі выдачу пазык на куплю і будаўніцтва жылля, альбо сур'ёзна паднялі працэнты, адчувальна негатыўна адбілася на попыце.

Летась крэдытаванне аднавілася, хай і з высокімі працэнтамі — у раёне 21 % гадавых, што не магло не адбіцца на пакупніцкай здольнасці, доля куплі нерухомасці ў крэдыт знізілася амаль у два разы, з 35 % да 18 %.

Тым не менш, людзі разважалі так: выдаюць крэдыты, значыць, усё добра і стабільна, год у цэлым выйшаў без сур'ёзных узрушэнняў. Узмацняюцца санкцыі — усе сталі задумвацца, што ж будзе далей? Можа, вось цяпер самы прыдатны момант, каб паспець? Плюс стрэсавыя перыяды апошніх гадоў відавочна паказалі, што можа быць яшчэ горш і невядома, што прынясе чарговы месяц.

Усё гэта зрушыла ў людзей прыярытэты ў бок жадання вырашыць кватэрнае пытанне і, у тым ліку, захаваць грошы ад курсавых ваганняў. Так 2021 год стаў рэкордным па продажах.

## Прадаўцы баяліся страціць усё або амаль усё

Другі год на фоне пандэміі абяцаў быць спакойным. Меркавалася, што калі назапашаны за крызісныя гады адкладзены попыт у асноўным рэалізаваў сябе летась, то ў 2022-м ужо не будзе такога ажыятажу. Але сітуацыя ў канцы лютага павярнула развіццё падзей у зусім непрадказальнае рэчышча.

Па выніках сакавіка колькасць здзелак куплі-продажу істотна ўпала (980 супраць 1266 годам раней, менш было толькі ў сакавіку ў эканамічна стрэсавых 2014—2015 гадах). А ў красавіку попыт пайшоў у рост, непрадказальны і нечаканы з улікам вельмі незразумелай абстаноўкі ў свеце. Шмат у чым гэтаму спрыяла цанавая лаяльнасць прадаўцоў — за сакавік кошт здзелак знізіўся на 8 %, што таксама можна лічыць пэўным рэкордам для Мінска.

Але чарада стрэсавых з'яў апошніх гадоў моцна загартавала менавіта пакупнікоў, навучыўшы іх разважаць максімальна рацыянальна і цвяроза, лічыць наш эксперт. Незалежна ад развіцця сітуацыі. Тое, што адбываецца, нагадала людзям, як усё нетрывала і наколькі эканоміка можа перашкодзіць іх планам купіць жыллё.

Увесну курс долара наогул адкаціўся назад і нават трохі знізіўся, а лаяльнасць прадаўцоў захавалася. У выніку за красавік у сталіцы купілі-прадалі 1382 кватэры, у маі — 1184 аб'екты. Рост адзначаўся ўсё лета, якое скончылася абсалютным рэкордам апошніх гадоў — 1536 здзелак куплі-продажу. Мінулы рэкорд на рынку другаснага рынку быў устаноўлены ў жніўні 2021 года — 1484 прададзеныя кватэры за месяц.

## Паспець абавязкова сёлета

Гэты год стане рэкордным, калі будзе ўстаноўлены чарговы максімум куплі аб'ектаў нерухомасці. Апошняе відаць па тэмпах продажаў кватэр у першы тыдзень снежня. За студзень—лістапад мінулага года ў Мінску было заключана 13,1 тысячы здзелак, а за аналагічны перыяд бягучага — ужо 14,1 тысячы.

Спецыялісты рынку нерухомасці ўвесь год задаваліся пытаннем, чаму пакупнікі ў такі складаны час не занялі чакальную пазіцыю? У агенцтве нерухомасці нават правядзілі ўласныя апытанні сярод патэнцыяльных пакупнікоў і тых, хто ўжо здзейсніў куплю. Дык вось, больш як 55 % з іх проста вырашала жыллёвае пытанне, укладваючы грошы ў пашырэнне, пераезд у новабудоўлю, купляла першую кватэру. Яшчэ 9 % разглядалі куплю кватэры як спосаб інвеставання — жыллё ў Мінску заўсёды будзе ў цане, вырашылі яны. А хтосьці вырашыў не адкладваць на потым, а купіць кватэру ўжо цяпер. Напрыклад, дзіцяці, пакуль яно вучыцца.

## Аднапакаёвая — 42 тысячы долараў па курсе

Апошнія даныя аб рэальным кошце кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў кажуць аб тым, што ў лістападзе квадратны метр аднапакаёвага такога жылля прапаноўваўся ў сярэднім за 1 240 долараў. Квадратны метр двухпакаёвай кватэры ацэньваецца ў 1140 долараў па курсе, а трохпакаёвай — 1115 долараў. Статыстыка паказвае, што аднапакаёвая кватэра стандартных спажывецкіх якасцяў каштуе 42 тысячы долараў, двухпакаёвая — 57 тысяч долараў, трохпакаёвая — 67 тысяч.

Зусім іншыя цэны існуюць на кватэры, гатовыя да пражывання. Квадратны метр гэтага жылля ў аднапакаёвым вымярэнні будзе ацэньвацца ў 1490 долараў па курсе. Метр у такой двухпакаёвай кватэры — 1340 долараў, у трохпакаёвай — 1230. Сярэдняя цана аднапакаёвай кватэры — 54 тысячы долараў, двухпакаёвай — 67 тысяч, трохпакаёвай — 76 тысяч.

## Кватэры бяруць, але прапанова амаль не змяншаецца

Сёлета рынак другаснай нерухомасці абсалютна не церпіць ад колькасці прапаноў. Калі прыкладна 7 тысяч кватэр, выстаўленых на продаж, звычайна дастаткова «для балансу», то ў пачатку года ў базе агульнага рынку было 9 тысяч аб'ектаў, цяпер жа — больш за 8,5 тысячы кватэр.

Гэта дастаткова вялікая колькасць пустых кватэр. Сюды трапіла і адкладзенае рашэнне людзей, якія з'ехалі раней з нашай краіны, але толькі цяпер сабраліся прадаваць сваю нерухомасць. Чарговая хваля з пакупнікоў-прадаўцоў пазірае ў бок новабудоўляў, каб палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. Бо цэннік на новае жыллё сёння стаў трохі ніжэйшы.

Характэрна, але кватэрны бум сёлета фінансаваўся амаль выключна з уласных накапленняў кліентаў. А вось крэдыты сталі браць у значна меншых аб'ёмах — занадта высокая працэнтная стаўка. У сакавіку доля пакупнікоў у крэдыт упала да 4 %, у красавіку было больш — 7 %, а сёння толькі 13—15 % пакупнікоў рашаюцца ўзяць сродкі на куплю жылля ў крэдыт. Для параўнання, у 2020 годзе такіх здзелак было каля 40 %.

## Канкурэнцыя другаснага жылля — новабудоўлі

Андрэй Чарнышоў адзначае, што цяпер у Мінску кліентам прапануецца 159 новабудоўляў — і на этапе будаўніцтва, і ўжо ўведзеныя ў эксплуатацыю. Характэрна, што два гады таму было значна менш прапаноў (117 дамоў). Атрымліваецца, што ніколі яшчэ рынак новабудоўляў не развіваўся гэтак актыўна, але...

Як аказалася, сёння пакупнік шукае больш бяспечныя хады, а набываць жыллё на стадыі катлавана асцерагаецца. Так, гэты год прымусіў пакупнікоў некалькі зрушыць сваю цікавасць у бок другаснага жылля. Дзесьці з сакавіка на рынку новабудоўляў ажыятаж нечакана знізіўся. Калі кватэра на другасным рынку даступная «тут і цяпер», то чаго чакаць ад забудоўшчыка праз пару гадоў ва ўмовах высокай турбулентнасці і нявызначанасці, незразумела. Таму большасць запытаў ад пакупнікоў, якія разглядаюць новабудоўлі, гучалі як «патрэбна кватэра ва ўжо гатовым доме па даступнай цане».

Калі да канца красавіка пакупнікі ставіліся да такой куплі досыць скептычна, то потым проста сталі ўсё лічыць з калькулятарам. Як аказалася, цэны на будматэрыялы таксама істотна выраслі. У выніку добрая кватэра на другасным рынку ўсё часцей станавілася альтэрнатывай новабудоўлі.

Зараз працуюць перадпанавагоднія акцыі і зніжкі. Таму сітуацыя накшталт як супакоілася, цікавасць да новабудоўляў стала вяртацца: здзелкі ідуць і вельмі актыўна. Новабудоўлю для куплі пачалі разглядаць практычна 90 % патэнцыяльных пакупнікоў першых кватэр. Эксперт амаль упэўнены, што снежань у цэлым таксама можа здзівіць па колькасці продажаў — пад канец года ўсе імкнуцца закрыць нелiквідныя здзелкі.

## Усё застанецца як раней, ці нават нязначна патаннее

Рабіць прагнозы можна з асцярожнасцю і адной важнай агаворкай: пры ўмове захавання цяперашняй сітуацыі, без яе паляпшэння або пагаршэння. Для рынку нерухомасці — гэта абменны курс долара і ўмовы крэдытавання.

Калі гэта ўсё захаваецца, то наўрад ці варта чакаць росту цэн як на другасным рынку жылля, так і на рынку новабудоўляў. Да гэтага няма ніякіх аб'ектыўных эканамічных перадумоў, як, напрыклад, павелічэнне даходаў пакупнікоў або зніжэнне кошту крэдытаў, лічыць спецыяліст. А чуткі аб тым, што жыхары суседніх краін масава скупляюць нерухомасць у Мінску і тым самым ўзнімаюць цэны на жыллё, застаюцца толькі прыватным меркаваннем.

Эксперты рынку адзначаюць, што для росту каціровак квадратнага метра (як на другасным рынку, так і на рынку новабудоўляў) няма ніякіх перадумоў, нягледзячы на пасяховы год для рынку нерухомасці і добры стабільны попыт. Наўрад ці гэтым прадаўцам удасца падняць цэны рэальных здзелак, як бы яны таго ні хацелі. Падняць цану прапановы магчыма, але ці пагодзіцца на яе пакупнік — вось у чым пытанне.

Каб цэны раслі, неабходныя аб'ектыўныя для гэтага ўмовы: рост заробкаў або даступнае крэдытаванне, лічыць **ганаровы старшыня асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.** На яго думку, на дадзеным этапе магчыма толькі запаволенне патаннення сталічнай нерухомасці, парадку 1—1,5 % за 3—6 месяцаў. У найлепшым выпадку, пры жаданні ўласнікаў самастойна павысіць цэны гэта прывядзе да больших зніжак, а ў найгоршым — да хуткага адкату цэн назад. Прапаноў на рынку і сапраўды дастаткова.

**Сяргей КУРКАЧ.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

# Візітка краіны

## Электронную «Беларускую энцыклапедыю» ствараюць у Нацыянальнай акадэміі навук

**Раней такія выданні выходзілі ў нашай краіне толькі на папяровых носьбітах. Яны, як правіла, вельмі дарагія, хутка старэюць, а іх абнаўленне магчымае толькі шляхам перавыдання, а гэта вельмі груваcткая і фінансава затратная працэдура. Купля шматтомных энцыклапедый мала каму даступная, таму яны перайшлі ў катэгорыю элітарнай літаратуры.**

Між іншым, энцыклапедыя — брэнд краіны. Яна адлюстроўвае яе станаўленне, развіццё, гісторыю і традыцыі. Таму год назад па ініцыятыве старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА ў структуры Цэнтральнай навуковай бібліятэкі акадэміі быў створаны Цэнтр энцыклапедычных выданняў. Узначаліла яго Соф'я Пятроўна САМУЭЛЬ — спецыяліст з вялікім вопытам работы над энцыклапедычнымі выданнямі, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Днямі яна прадставіла праект электроннай версіі новай «Беларускай энцыклапедыі» Уладзіміру Гусакову.

На думку Соф'і Самуэль, энцыклапедыя абавязкова павінна прысутнічаць у інтэрнэце. Яна стане ўнікальнай электроннай візіткай Беларусі, зробіць яе пазнавальнай на міжнароднай арэне. У адрозненне ад друкаванай электронная энцыклапедыя не абмежавана аб'ёмам, а састарэлую інфармацыю ў ёй можна аператыўна актуалізаваць. Усе даныя шматразова правяраюцца, усе артыкулы рэцэнзуюцца. Такім чынам, дасягаецца навуковая дакладнасць.

Электронная энцыклапедыя будзе змяшчаць сістэматызаваную, навукова выверанную інфармацыю аб людзях, аб мінулым і сучаснасці Беларусі, яе прыродзе, рэсурсах, эканоміцы, навуцы, культуры і сацыяльнай сферы, прапагандаваць дасягненні краіны, паказваць яе магчымасці, месца і ролю ў сусветнай цывілізацыі, павышаць аўтарытэт і інвестыцыйную прывабнасць.

Як адзначыла Соф'я Самуэль, праект сайта «Беларуская энцыклапедыя» распрацаваны з улікам сусветнага вопыту. Пачата падрыхтоўка матэрыялаў па тэмах «Беларусь у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах» і «Прырода Беларусі». У далейшым працягнецца праца над іншымі раздзеламі (пакуль іх выдзелена 10). Уводным раздзелам стане тэматычная энцыклапедыя «Рэспубліка Беларусь». Тэксты будуць прадстаўлены на беларускай і рускай мовах, у будучыні — на англійскай і іншых. Зараз ідзе падбор аўтарскіх калектываў, кадраў для далейшай рэалізацыі праекта.

Як падкрэсліў Уладзімір Гусакоў, работу над энцыклапедыяй трэба працягваць, даводзіць да канца, шырока знаёміць з яе вынікамі грамадскасць. Важна не страціць унікальны фотаматэрыял, які акумулюецца ў розных акадэмічных установах. Ён мусіць выкарыстоўвацца ў напаўненні новай энцыклапедыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Уладзімір ЗІНКЕВІЧ:**

# «МАЁ МАСТАЦТВА — ГЭТА ДЫЯЛОГ З ЧАЛАВЕКАМ НА ЦІХІХ НОТАХ»

## Моцныя думкі творчага чалавека

**Прывабнасць мастацтва ў тым, што яно нікога не пакідае раўнадушным. Кожны знойдзе для сябе нешта цікавае: карціны, якія западаюць у самае сэрца, незвычайныя лёсы мастакоў... На адной выстаўцы можна цалкам адчуць бязмежную сілу чалавечага таленту. «Звязда» разам з галерэяй «АртХаос» вырашылі пазнаёміць усіх з гэтай сілай.**



Моц мастацтва — у сіле талентаў творцаў, у іх унікальным бачанні свету, іх асаблівых думках і настроях. Адсюль і незвычайныя мастацкія тэхнікі, якія прываблі-



ваюць гледача. Спытай яго — чым захапіла тая ці іншая карціна — і не кожны адкажа. А адарваца не можа, бо бачыць нешта сваё, намагаецца знайсці свае сэнсы і адказы на асабістыя пытанні. Як у тумане ці ў смузе. Ці як на карцінах, выкананых у тэхніцы сфумата (ад італьянскага sfumate — прыглушыць або смуга). Такая тэхніка дазваляе зрабіць пераходы паміж ліініямі і колерамі размытымі, падобнымі на дым. Прыхільнікам гэтай тэхнікі падчас эпохі Адраджэння быў Леанарда да Вінчы. А ў сучаснай Беларусі ў дадзенай тэхніцы (і не толькі) працуе Уладзімір Зінкевіч, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, кавалер ордэна Францыска Скарыны, ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў, загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, прафесар. «Звязда» пацікавілася яго «моцнымі думкамі».

**«Лёс узяў мяне ў абдымкі і павёў па шчаслівай сцежцы.** Я родам з Гомельшчыны. Маё дзяцінства прайшло ў краі містычных балот, туманаў, бязмежнай прасторы, што, безумоўна, налажыла адбітак на творчасць. Мне было сем гадоў, калі мы з бацькамі пераехалі ў Светлагорск. А да тога ўзросту была дзіўная пара сузіральнасці і адносін са светам. І гэта засталося са мной назаўсёды. Займацца мастацтвам я пачаў дастаткова позна, тады ў хлопчыкаў у большай пашане быў спорт. Таму да 13 гадоў я займаўся боксам, а затым у нашым горадзе з'явілася цудоўная мастацкая студыя. Заняткі вёў выдатны чалавек Уладзімір Барысавіч Юшпрах, і ён звярнуў на мяне ўвагу. Я нешта рабіў, маляваў, але ўсё гэта было няярка. Магчыма, яно нешта казала аб маіх магчымасцях, але нічога звышнатуральнага там не было. А затым — паступленне ў Мінскае мастацкае вучылішча, вядомае як «Глебаўка». Конкурс быў вялізны, але я паступіў. І пачалася незабыўная старонка жыцця.



**Самае галоўнае — энергетыка.** У вучылішчы была неверагодная творчая атмасфера. Нам выкладалі Альгерд Малішэўскі, Мікалай Залозны — людзі, якія абсалютна выпучаліся ў сваім творчым светапоглядзе і былі вельмі энергічнымі выкладчыкамі. А энергетыка чалавека — адна з найважнейшых яго якасцяў. Можна казаць добрыя рэчы, але без энергіі яны не знойдуць водгуку. А нашы выкладчыкі сваёй энергіяй улюблялі ў сябе, а не падпарадкоўвалі. Яны давалі надзею, што існуе нейкі іншы свет, акрамя бытавога. І гэты свет здаваўся нам патаемным і вельмі цікавым. Вучылішча было школай выхавання. Мне пашанцавала, што побач са мной былі такія цікавыя людзі.

**Мяне выхавалі драўляная скульптура, вітражы Сярэднявечча, неверагодная калькасць мастакоў і вялізны пласт спадчыны сусветнага мастацтва.** Кафедра, якую я цяпер узначальваю, — манументальная. Яна змяшчае скарб розных напрамкаў: ад фрэскавага жывапісу да сучасных стыляў. Таму гэты кангламерат разнастайных тэхнік і сёння працуе на мяне і на нашу кафедру. Менавіта багаццем тэхнік і прыёмаў яна адрозніваецца ад іншых кафедраў.

**У мастацкай ВНУ навука — частка выхаваўчага працэсу.** Гэта не ўсё. У нас вельмі маленькі курс — шэсць чалавек. І таму з кожным студэнтам мы працуем індывідуальна. Многае залежыць ад ведаў, магчымасцяў і таленту выкладчыка. Але на першым месцы — яго энергетыка. У рабоце з моладдзю самае важнае — сфарміраваць «энергетычнае» асяроддзе. Задача выкладчыка мастацкага ВНУ — улюбіць студэнта ў прафесію і сфарміраваць у ім веру, што гэтая прафесія неабходная для чалавека.

**Каб стварыць манументальны твор, трэба аб'яднаць вакол сябе людзей.** Маім выкладчыкам быў Аляксандр Міхайлавіч Кішчанка — вялікі чалавек не толькі для нашай краіны, але і для еўрапейскай супольнасці. Яго манументальныя работы — вялізная праца. Каб зрабіць такія пано, як на дамах праспекта Незалежнасці, якімі захапляюцца ўсе госці Мінска, трэба валодаць моцным здароўем і ўмець улюбіць іншых людзей у сваю ідэю. Для гэтага неабходны асаблівы стан. Першы яго складнік — вопыт. Другі — веды. Трэці — энергетыка, якая пераходзіць у інфармацыю і працуе на тых, хто побач.

**У Беларусі склалася надзвычай цікавая школа сучасных мастакоў.** Яны розныя і вельмі цікавыя: манументалісты, жывапісцы, скульптары. Вельмі моцная супольнасць. Мяне захапляе, што яны не падобныя на нас. Нараджаюцца новыя асобы. І асноўная задача работы, старэйшага пакалення — захаваць у чалавеку яго сапраўдны патаемны пачатак.



**Самае сумнае, што мы забываем такую вялікую рэч, як любоў.** Якія б механізмы ні ўдзельнічалі — выдатная фактура, найлепшыя фарбы, — на першым месцы пры стварэнні карціны — любоў, пачуцці, эмоцыі. Менавіта яны паказваюць, як мастак успрымае чалавека ці цэлае асяроддзе. Калі таго няма, гэта не мастацтва, а рамяство і нуда. Можна дасягнуць неверагодных вынікаў у рамястве. Можна спрацаваць неверагодна дэталёва, але пазбавіць карціну душы, не ўзбагаціць яе пачуццямі і эмоцыямі. Тады гэта будзе механічна прыгожая форма. Калі мы паглядзім на час наіўнага мастацтва — гэта геніяльнае мастацтва. Яны не прафесіяналы, але стварылі пачуццёвы свет, таму што былі вельмі ўлюбёныя ў яго.

**Трагедыя сучаснага мастацтва ў тым, што яно пазбаўляецца пачуццяў.** Сфумата — гэта ўзаемаадносіны чалавека і навакольнага свету. Гэта пытанне ўнутранай цішыні. Я хацеў бы падкрэсліць, што сутнасць згаданай тэхнікі не ў манеры яе выканання — яна звязана са станам маіх пачуццяў. І маё мастацтва — дыялог з чалавекам на ціхіх нотах. Сёння нам не хапае ціхага дыялогу. Я стараюся яго перадаць праз тонкасць фарбаў, розre насць матэрыялаў.

**Мая жонка Валянціна Сідарава — не проста мая муза: яна выхавала мяне як асобу.** І самая яркая выстаўка ў маёй кар'еры «Вясёлка ў вадзе», якая адбылася ў 2016 годзе ў Абу-Дабі, стала магчымай дзякуючы ёй. Гэта быў праект Валянціны, яе ідэя, а я працаваў як выканальнік. Яна ўлюбіла і мяне ў той праект. Выстаўка вельмі ўдала супала з рознымі кірункамі і сабралася ў адзіны варыянт. Атрымалася вельмі якасна. «Вясёлка ў вадзе» значна адрознівалася ад таго, што я рабіў раней. У лістападзе 2023 года ў галерэі «Белгазпрамбанка» адбудзецца мая вялікая выстаўка. Цяпер я актыўна да яе рыхтуюся. Спадзяюся, што яна не падмане ні маіх чаканняў, ні чаканняў майго гледача».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



След на зямлі

# БУХГАЛТАР З ДУШОЮ МАСТАЧКІ

***«Жыццё пражыць — / Не поле перайсці, / А трэба і жыццё / Прайсці, як поле, / І хоць адным зярняткам узысці, / А бур'яном не зарасці ніколі».***
**З паэтам не паспрачаешся: чалавек і сапраўды жыве дзеля таго, каб пакінуць след, каб застацца ў памяці — у першую чаргу сваіх родных.**

А таму, шчыра кажучы, я вельмі здзівілася візіту Валянціны Лысюк, якая прапанавала нашай бібліятэцы некалькі матуліных вышыванак. «Вам не шкада развітвацца з такой прыгажосцю?» — спытала ў жанчыны і пачула, што большасць работ, вядома ж, засталася ў сям'і, частку Валянціна Канстанцінаўна занесла ў раённы Дом рамёстваў, Дом дзіцячай і юнацкай творчасці...

Паміж намі завязалася размова, падчас якой я пачула гісторыю жыцця звычайнай і ў той жа час незвычайнай жанчыны.







Нарадзілася Любоў Пятроўна Лісок (дзявочае прозвішча Гуліна) у Расіі, на Пскоўшчыне. У 1942-м, калі дзяўчынцы было ўсяго восем, каля іх вёскі Слабада ішлі кровапралітныя баі. Людзі, каб застацца ў жывых, уцякалі са сваіх дамоў, выкопвалі зямлянкі. Любіну ж матулю разам з бацькамі і трыма дачушкамі немцы загналі ў таварны вагон і павезлі невядома куды. Спадарожнікі казалі, што далёка, у саму Германію.

Але ж праз нейкі час цягнік сцішыў сваю ходу і спыніўся. Побач з вагонам аказалася эстакада, пад якой Любінай сям'і ўдалося схавацца. Далей цягнік паехаў без іх, а яны, бежанцы, апынуліся ў поўнай невядомасці: без ежы, без адзення, без даху над галавой...

І ў той жа час — хоць з нейкім, але спакоем, бо тут было ціха: Ганцавічы не бамбілі. Да таго ж сям'я была разам.

Яе, немаленькую, і заўважыў на дарозе пан Кавальскі з Хатыніч. У яго гаспадарцы рабочыя рукі заўсёды былі патрэбныя. Вось ён і падабраў бежанцаў.

Размясціліся навасёлы ў свірне, і першае, што зрабіла матуля, — павесіла на покуць абразы, якія паспела ўзяць з роднай хаты.

Пад імі яны і жылі, чакалі канца вайны. На радзіму не вярталіся, бо не было куды. Ды і тут...

Чарговае выпрабаванне чакала сям'ю, калі згарэў іх часовы прытулак, іх свіран. І зноў з усіх пажыткаў у іх засталіся дзве іконы і славутая швейная машынка «Зінгер», якая не раз ратавала сям'ю ад холаду і голаду, і якую, ужо ў якасці рэліквіі, нашчадкі захоўваюць па сённяшні дзень.

...Па-рознаму склаўся іх лёс. Люба-Любачка сустрэла сваё каханне ў школе рабочай моладзі. І амаль следам за ім прыйшло расстанне, бо яе абранніка аж на чатыры гады забралі ў войска.

Люба дачакалася яго, і ў 1958-м у нашых Ганцавічах з'явілася новая сям'я, заснаваная на каханні, павазе і клопаце адно аб адным, а потым і траіх дзецях. Для іх, Аляксандра, Валянціны і Сяргея, бацькі былі прыкладам ва ўсім. Канстанцін Цімафеевіч доўгі час працаваў у раённым ваенкамаце, Любоў Пятроўна вяла бухгалтэрыю ў розных установах горада. На захапленні ў яе маладыя гады часу не было, а вось на так званым заслужаным адпачынку жанчына засела за карункі ды вышыванне. Сям'я, сабраўшыся ў доме бацькоў, садзілася за стол засланы прыгажэнным атласным абрусам, вышытым нібы жывымі кветкамі... Ці не ўсе куточкі ў хаце гаспадыня ўпрыгожыла сурвэткамі, звязанымі шыдэлкам.

...Любоў Пятроўна, якая змалку палюбіла нашу зямлю і людзей, творчасць Якуба Коласа і Янкі Купалы, беларускія песні і ўзоры, пакінула пасля сябе сапраўднае багацце: сваіх дзяцей і ўнукаў, свае ручнікі, сурвэткі, абрусы, якія па-ранейшаму служаць яе родным і блізкім, яе землякам. Прынамсі, кожны, хто знаёміцца з чарговай кніжнай выставай, ведае, што ў нашай бібліятэцы яна аздоблена творамі майстрыхі ад Бога Любові Пятроўны Лісок.

**Тацццяна Маляўка,**
*г. Ганцавічы.*

Паміж намі, жанкамі

## НАДЗЕЯ ПАМІРАЕ АПОШНЯЙ...

**...Зайздрошчу маладым, па-добраму зайздрошчу. Яны сёння зусім не прывязаны да рэчаў: нейкі час не карыстаўся, не насіў, значыць, трэба пазбавіцца.**

Я не такая: мне цяжка не тое што выкінуць, нават вывезці нешта ў вёску, бо заўсёды ўспамінаецца, дзе што купіла ці пашыла, куды прыбіралася, як пры тым выглядала... Дарагія ёсць рэчы, любімыя. Адна сукенка — дык на ўсе выпадкі жыцця.

Днямі збіралася выйсці «ў людзі», думала, што б такое надзець? Зазірнула ў шафу, што-нішто патрымала ў руках ды памерала, цяжка ўздыхнула: тое і сапраўды ўжо не моднае, тое, на жаль, замалое, тое не пасуе па колеры...

У пошуках сваёй любімай універсальнай сукенкі перабрала ўсе вешалкі ў адной шафе, потым у другой. Палтэргейст ды і толькі: няма! Як карова языком злізала!..

Ноч, можна сказаць, не спала, думала, куды ж яна дзелася?

Раніцой, на ўсякі выпадак, зазірнула ў шафу для вопраткі і...

Знайшлася мая прапажа: яна пад куртачку схавалася. Прычым — не сама. Дачка сказала, што мае ўборы прымяралі ўдзвюх з унучкай і потым не туды павесілі...

Дык можа праўду кажуць, што ўсё новае — гэта добра забытае старое, і сукенкі бабуль яшчэ могуць паслужыць унучкам? Надзея памірае апошняй.

**Ірына Салата,**
*г. Гродна.*

Чалавек — чалавеку

## ЛЮБОЎ ДА БЛІЗКАГА... ВОСЬ ШТО ГАЛОЎНАЕ!

**Яшчэ з пачатку снежня ў многіх пачынае паляпшацца настрой: мы рыхтуемся, мы стараемся весела сустрэць Новы год.**
**У прамінулыя, камуністычныя, часы не ўсе, на жаль, успаміналі пра іншае, куды большае свята.**

...У нашу сям'ю калядная казка прыходзіла разам з ёлкай, якую прыносіў тата. Нейкі час яна адтайвала, «грэлася» ў хаце, напаўняючы яе непаўторным пахам, і толькі потым займала месца на покуці, пад абразамі. Для яе, лясной прыгажуні, мы загадзя клеілі папяровыя ланцужкі, выразалі з фольгі сняжынкі, на нітачках развешвалі цукеркі і пячэнне.

У памяці і перадкалядны стол. Проста дзіву даешся, як можна было з мінімальнага набору прадуктаў прыгатаваць тыя ж 12 страў! На саматканы абрус, якім накрываўся зацярушаны сенам стол (на знак таго, што Хрыстос нарадзіўся ў хляве), наша матуля ставіла куццю, квас з сушаных грыбоў, аладкі з макавым малачком, селядзец з цыбуляй, запечаную рыбу, кісель... Цэнтральнае месца займала запаленая свечка. Вячэра пачыналася чытаннем урыўка з Евангелля.

...Прадстаўнікі самых розных канфесій у нас, у Беларусі, жывуць у міры і згодзе, з павагай ставяцца да веравызнання іншых, што зусім не дзіўна, бо догмат кожнай — любоў да блізкага. І вось гэта, галоўная, запаведзь, як мне здаецца, змяшчае ў сабе ўсе астатнія: любячы, мы не зробім іншаму аніякага зла і не будзем чакаць яго самі.

**Вольга Фядзяшына,**
*г. Слуцк.*

Свой погляд

# «Не прадаецца хата бацькоў»

**Слухаю гэту песню (просьбу, параду?) і ўспамінаю сваю, пасляваенную, халодную, уpraslую ў зямлю хацінку, нашу гаротніцу-маму. Тата, партызанскі сувязны, вясной 1944-га падарваўся на міне і, паміраючы, папрасіў яе аб адным: зберажы дзяцей. Усіх нас было пяцёра. Старэйшаму сыну ішоў толькі дванаццаты год, мне, малодшай, было два месяцы.**

Сказаць, што нашай маме было вельмі цяжка, азначала б не сказаць нічога. Аднак яна несла свой крыж, яна выжывала, але выконвала наказ нябожчыка-мужа. Ва ўсёй акрузе ёй проста роўных не было па працавітасці, па самаахвярнасці ў імя дзяцей! Ва ўсякім разе, ніхто з нас мама не здала ні ў дзяцячы дом, ні ў школу-інтэрнат (хоць гэта ёй і прапаноўвалі), ніхто ніколі не пасылала жабраваць ці, крый божа, красці чужое.

Мае браты, на выдатна скончыўшы сямігодку, па чарзе паступалі ў сярэднія спецыяльныя ўстановы (там студэнтаў забяспечвалі спецадзеннем і харчаваннем), атрымлівалі рабочыя прафесіі, працавалі і завочна вучыліся далей. У выніку два старэйшыя займалі адказныя пасады на металургічным камбінаце ў Нарыльску, адзін — у Новасібірску, адзін — у Амсукчане, што ў Магаданскай вобласці...

Але ж куды б лёс ні закінуў іх, як бы далёка ні жылі, ні працавалі, а маму помнілі заўсёды, стараліся прыехаць, дапамагчы, урэшце заключылі дагавор з мясцовай ПМК і пабудавалі ёй новы дом у вёсцы Капланцы.

Цяпер тут жыву я і прадаваць дом, вядома ж, не збіраюся.

...Мая аднавяскоўка Раіса Іванаўна Рашэцька, захварэўшы, таксама прасіла дзяцей, каб хоць бы не прадавалі хату, каб яна па-ранейшаму была прытулкам для ўсіх сваіх.

...Чужыя на тым падворку з'явіліся перад апошнім ваенным Вялікаднем у так званую чырвоную суботу. Гаспадыня — маці Раісы Іванаўны — напякла тады хлеба, адварыла мяса, нафарбавала яек і ўсё гэта да заўтрашняй раніцы занесла ў стопку, замкнула. «Адмыкай!» — загадалі ёй двое ўзброеных коннікаў. Жанчына ад страху выпусціла з рук ключы і ніяк не магла адшукаць. Адзін з бандытаў выстраліў... «Сволачы! Што ж вы нарабілі!» — закрычала на мужчын свякроў і таксама загінула ад куль... Бандыты выграблі з варыўні ўсе прадукты і зніклі ў найбліжэйшым лесе. У хаце засталося шасцёра малых сірот.

...Дзеці старэйшай з іх, Раісы Іванаўны, выканалі волю маці: не сталі прадаваць бацькоўскую хату. Зяць Віктар Фясун разам з жонкай Марынай, пакінуўшы кватэру ў Мінску, навялі тут проста ўзорны парадак. Яны рады працаваць на зямлі самі, рады прымаць дзяцей і ўнукаў, сяброў, сваякоў.

І прыкладаў такіх нямала: у нашу вёску, на бацькаўшчыну, вярнуліся Мікалай Шалай, Людміла Калола, Ніна Ліс, Таіса Бараўля, Ганна Кавалёнак і многія іншыя.

У кожнага з іх свае сем'і і свае прычыны на тое, каб вярнуцца ў хату бацькоў. Але ёсць, як мне здаецца, і адна агульная: не прадаўшы яе, радзіму (помніце фільм «Гараж»?), захаваўшы дом для сваіх наступнікаў, яны такім чынам збераглі гісторыю яго будаўніцтва, а па вялікім рахунку — гісторыю жыцця сваіх папярэднікаў. А гэта значыць, яшчэ і сваю.

**Ніна Бурко,**
*Бярэзінскі раён.*

**МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ**

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

14 снежня 2022 г. № 48 (684)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# МАРШРУТ ПАТРЫЁТАЎ

## Вядзецца актыўная падрыхтоўка да праекта «Цягнік Памяці — 2023»




sovrep.gov.by




Фота БелТА.



**У Савеце Рэспублікі прайшло пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па пытаннях правядзення ў 2023 годзе беларуска-расійскага праекта «Цягнік Памяці». Пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА ўдзельнікі разгледзелі геаграфію правядзення патрыятычнай акцыі, падыходы да адбору ўдзельнікаў праекта, а таксама праграму «Цягніка Памяці — 2023».**

### Геаграфія пашыраецца

Падчас пасяджэння Віктар Лісковіч адзначыў, што ўдзельнікі з Кыргызстана, Казахстана і Арменіі плануюць далучыцца да праекта. Але наперадзе яшчэ шмат работы. Напрыклад, плануецца, што ўдзельнікі «Цягніка Памяці» мінулага года стануць рэтранслятарамі: яны сустрэнуцца з іншымі школьнікамі і падзеляцца досведам і ўражаннямі ад удзелу ў патрыятычным праекце:

— Нам трэба ўключыць у гэту работу на першым этапе не толькі дзесяцікласнікаў. Конкурс павінен прайсці ва ўсіх школах краіны, а іх тры тысячы. У кожнай школе адбудзецца першы этап, падчас якога трэба задзейнічаць практычна ўсіх дзяцей. Праект будзе штогадовым. Да таго часу, калі дзіцяці споўніцца 16 гадоў, яно будзе свядома разумець значнасць праекта і ўмовы яго рэалізацыі, — падкрэсліў Віктар Лісковіч. — Мы павінны давесці да бляску гэтае мерапрыемства, каб яно стала эталонам усёй патрыятычнай работы ў маладзёжным асяроддзі.

### У «Цягнік» — на конкурснай аснове

Як адзначыла **першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА,** удзельнікаў праекта «Цягнік Памяці» ў 2023 годзе будуць выбіраць на конкурснай аснове:

— У склад удзельнікаў праекта будуць уключаны найлепшыя навучэнцы з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай, грамадскай, спартыўнай, валанцёрскай дзейнасці, актывісты БРСМ, вучні ваенна-патрыятычных, кадэцкіх класаў, выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў, членаў маладзёжных парламентаў.

стар. 8

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## «Перад намі адкрыліся ўнікальныя магчымасці па рэалізацыі праектаў»

### Расказваем навіны мінулага тыдня з Савета Рэспублікі

• Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва Таццяна Рунец бярэ ўдзел у мерапрыемствах асамблеі ў Бялградзе. Удзельнікі разгледзелі спектр пытанняў гандлёва-эканамічнага, фінансавага і гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — членаў Арганізацыі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва. Таццяна Рунец правяла шэраг двухбаковых сустрэч.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў узяў удзел у медыяфоруме «Беларусь — Расія: раўнапраўны саюз, агульная гісторыя, сумесная будучыня», прысвечаным 23-й гадавіне падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Парламентарый адзначыў важнасць далейшага паглыблення інтэграцыі Беларусі і Расіі ў кантэксце процідзеяння беспрэцэдэнтнаму знешняму ціску. Па яго словах, прыярытэт беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў палітыка-гуманітарнай сферы — захаванне праўды аб Вялікай Айчыннай вайне.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч абмеркаваў з членамі міжведамаснай камісіі вынікі маніторынгу функцыянавання дома-інтэрната «Сямейны прычал». Сенатар падкрэсліў, што трэба ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу пытанням сацыяльнай падтрымкі пажылых людзей. Мясцовым органам улады неабходна пастаянна быць на сувязі з кіраўніцтвам арганізацый, якія прапануюць сацыяльныя паслугі пажылым грамадзянам і інвалідам, дапамагаць у вырашэнні праблемных пытанняў.

• Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар сярэдняй школы № 14 г. Маладзечна Каліна Капуцкая сумесна з прадстаўніком Маладзёжнага парламента Маладзечанскага раёна Надзеяй Кулік правяла прамую тэлефонную лінію. Людзі звярталіся з пытаннямі працаўладкавання, урэгулявання сямейных адносін, вызначэння месца жыхарства дзяцей пры разводзе бацькоў. Па-ранейшаму грамадзян цікавілі пытанні жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадаркі (занепакоеныя несвоечасовай прыборкай снегу). Прамую тэлефонную лінію правёў і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Віктар Ананіч. Да парламентарыя звярнуліся жыхары розных рэгіёнаў краіны, у асноўным Мінскай і Магілёўскай абласцей.

• Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый Дзямідаў сустрэўся з прадпрымальнікамі Наваполацка. «Сёння вельмі актуальныя пытанні прыцягнення інвестыцый у эканоміку горада, падтрымкі суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу, стварэння імпартазамяшчальных прадпрыемстваў колькасцю сто і больш чалавек. Мы бачым, што рэзервы для гэтага ёсць. На такіх сустрэчах нам трэба будзе выпрацаваць дзейсныя механізмы развіцця і падтрымкі прадпрымальніцтва ў нашым горадзе. У сувязі з уведзенымі Еўрасаюзам санкцыямі перад намі адкрыліся ўнікальныя магчымасці па рэалізацыі любых праектаў па вытворчасці імпартазамяшчальнай і экспартаарыентаванай прадукцыі. Але гэты час магчымасцяў будзе нядоўгім, і нам трэба хутчэй заняць свабодныя нішы. Мы гатовыя аказаць дапамогу бізнесу як з боку мясцовай улады, так і выйсці з адпаведнымі ініцыятывамі на заканадаўчы ўзровень. Гэтае своеасаблівае акно магчымасцяў павінна стварыць станоўчы эфект для развіцця і станаўлення нашых прадпрыемстваў», — адзначыў сенатар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СТАЎКА НА ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

## Старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК — пра асаблівасці работы з насельніцтвам і маладзёжны інтарэс



**Літаральна на мінулым тыдні ў Магілёве адбыўся круглы стол па тэме «Роля дэпутацкага корпуса ў рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця ў вобласці». У размове прымалі ўдзел парламентарыі, дэпутаты ўсіх узроўняў, прадстаўнікі выканаўчай улады і бізнесу. Сёння, калі краіна працуе ва ўмовах жорсткіх санкцый і знешніх пагроз, вельмі важна захаваць стабільнасць і адзінства сярод грамадства. Работа з насельніцтвам заўсёды застаецца для дэпутатаў справай прыярытэтнай. Пра тое, чым быў адметны гэты год, што атрымалася рэалізаваць, якія задачы стаяць перад дэпутацкім корпусам Магілёўскай вобласці, — у нашай размове са старшынёй Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірынай РАІНЧЫК.**

— Прадстаўнікі дэпутацкага корпуса Магілёўшчыны заўсёды на перадавой, — усміхаецца суразмоўніца. — Удзельнічаем у дыялогавых пляцоўках, сустрэчах з актывамі працоўных калектываў па актуальных пытаннях развіцця краіны і рэгіёнаў, праводзім выязныя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі. У практыку работы аблсавета ўключаны выязныя пасяджэнні сесій, прэзідыумаў, пастаянных камісій, дзе разглядаюцца актуальныя пытанні праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці, комплексы мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржпраграм. На працягу 2021—2022 гадоў дэпутацкі корпус прымаў актыўны ўдзел у суботніках, дабрачынных акцыях, мерапрыемствах, прысвечаных Году народнага адзінства і Году гістарычнай памяці. Дзеля абагульнення найлепшага вопыту работы раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і распаўсюджвання яго сярод іншых Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў сумесна з аблсаветам праводзіць тэматычныя семінары-нарады з удзелам старшынь гарадскіх, раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў. Дэпутаты па месцы жыхарства грамадзян работаюць над тым, каб іх выбаршчыкі прымалі рэальны ўдзел у кіраванні справамі тэрыторыі.

***— Сёння ў грамадстве прапагандуецца здаровы лад жыцця. Дэпутаты Магілёўшчыны і тут паказваюць прыклад — праводзяць штогадовыя летнія і зімнія спартакіяды.***

— Спорт выхоўвае ў чалавеку самыя лепшыя яго якасці — мэтанакіраванасць, рашучасць, уменне дзейнічаць у камандзе. Менавіта гэтыя якасці дапамагаюць дэпутатам праяўляць свой патэнцыял у ходзе спаборніцтваў і дасягаць перамог на спартыўнай арэне падчас зімовай і летняй спартакіяд. Сёлета яны праходзілі ў Магілёве і Кіраўску.

***— Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка падчас рэспубліканскага семінара-нарады, прысвечанага ўдасканаленню метадаў і форм работы з насельніцтвам звярнуў увагу на тое, што па гэтай рабоце вызначаецца паказчык прафесіяналізму кіраўніцтва на месцах...***

— У гэтым пытанні галоўным памочнікам як для людзей, так і для мясцовых органаў улады з'яўляюцца органы мясцовага самакіравання. Гэта Саветы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, вулічныя і дамавыя камітэты, старшыя па дамах, пад'ездах, старасты, старэйшыны. Адным з эфектыўных падыходаў з'яўляецца рэалізацыя грамадскіх ініцыятыў, накіраваных на вырашэнне пытанняў мясцовага значэння: добраўпарадкавання дзіцячых пляцовак, паляпшэння месцаў масавага адпачынку, рамонту аб'ектаў культуры, стварэння і развіцця спартыўных аб'ектаў, добраўпарадкавання памятных месцаў і месцаў пахавання і іншых. За чатыры апошнія гады было падтрымана 175 ініцыятыў, толькі сёлета рэалізавана 55 праектаў. Адной з галоўных крыніц падтрымкі актывістаў з'яўляецца абласная Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. І механізм стымулявання ініцыятыўнай дзейнасці ўдасканальваецца. Сёлета, напрыклад, сем грамадзянскіх праектаў былі рэалізаваны пры фінансавай падтрымцы Банка развіцця Рэспублікі Беларусь. У дадзены момант дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні прыняты праект Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, які прадугледжвае фінансаванне з бюджэтаў краіны і вобласці ў роўных частках. У вобласці фарміруецца банк праектаў, якія будуць падтрыманы на конкурснай аснове для рэалізацыі ў наступным годзе.

***— Якія існуюць формы найбольш эфектыўнага ўзаемадзеяння дэпутатаў з насельніцтвам?***

— На першы план выходзіць тлумачальная работа з людзьмі. Усе павінны разумець, што не трэба паддавацца на правакацыі і фэйкі. Мы абаранялі і будзем абараняць інтарэсы нашых грамадзян. Асаблівая ўвага аддаецца псіхалагічнаму мікраклімату ў працоўных калектывах. Яшчэ адзін прыярытэт у супрацоўніцтве з выбаршчыкамі — работа з іх зваротамі. Жыхары звяртаюцца да нас з самымі рознымі пытаннямі, пачынаючы ад жыллёва-камунальных і заканчваючы аховай здароўя і пенсіённым забеспячэннем. І вельмі важна ў вырашэнні грамадскіх праблем не даходзіць да фармалізму. Народныя абраннікі асабістым прыкладам паказваюць усім канструктыўную грамадзянскую пазіцыю. Стаўка робіцца на моладзь. Важным аспектам нашай работы застаюцца сустрэчы з моладдзю, удзел у прапанаваных маладымі людзьмі праектах і ініцыятывах.

***— Дэпутаты наогул сталі для моладзі прыкладам для пераймання. Першыя спробы сябе ў кіраванні краінай яны робяць менавіта ў складзе маладзёжных парламентаў пры мясцовых Саветах дэпутатаў.***

— Так. Гэта той патэнцыял маладых людзей, якія гатовыя ўключацца ў вырашэнне дзяржаўна значных задач. Маладзёжныя парламентарыі першага склікання пачалі працаваць пры абласным Савеце яшчэ ў 2020 годзе. Сёння ў Маладзёжным парламенце ёсць прадстаўнікі з усіх райцэнтраў і гарадоў.

Мы запрашаем іх на пасяджэнні сесій, на прыёмы па асабістых пытаннях, выязныя прэзідыумы, круглыя сталы па пытаннях, якія хвалююць насельніцтва. Маладыя парламентарыі вобласці з'яўляюцца ўдзельнікамі практычна ўсіх важных мерапрыемстваў у нашым рэгіёне і краіне. Яны прадстаўлялі Магілёўшчыну на Усебеларускім народным сходзе, Рэспубліканскім педагагічным савеце, актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзенні Рэспубліканскага рэферэндуму па змяненнях у Канстытуцыю. Гэта значыць, яны сапраўды паглыблены ў тое, што адбываецца ў нашай вобласці і краіне, ведаюць усё не па чутках. І тую праўду яны транслююць сваім аднагодкам, вырашаюць важныя для свайго рэгіёна і вобласці пытанні. Гэта валанцёрскі рух, работа з падлеткамі, якія трапляюць у цяжкую жыццёвую сітуацыю, з маладымі сем'ямі. Яны працуюць па прынцыпе «роўны навучае роўнага». Малады чалавек хутчэй паслухае аднагодка, чым дарослага, лягчэй адмовіцца ад тых жа дрэнных звычак і вернецца да нармальнага жыцця.

***— Законам «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» прадугледжаны новы кірунак — падтрымка маладзёжных ініцыятыў. Гэта адкрывае перад моладдзю новыя гарызонты?***

— Рэалізацыя дадзенага кірунку дазволіць аказваць падтрымку праектам і ініцыятывам маладзёжных грамадскіх арганізацый. Пры гэтым прадугледжваецца бюджэтнае фінансаванне, якое будзе выдзяляцца на конкурснай аснове. Прыняцце згаданага законапраекта ідзе ў развіццё абноўленай Канстытуцыі, у 32-м артыкуле якой выразна зафіксавана, што дзяржава ставарае ўмовы для раскрыцця патэнцыялу нашай моладзі. Закон накіраваны перш за ўсё на тое, каб стварыць прававыя ўмовы для рэалізацыі моладдзю канструктыўных праектаў і розных ініцыятыў. У найбліжэйшы час гэты закон уступіць у дзеянне, і малады людзі, аб'яднаныя не толькі ў рамках канструктыўных грамадскіх арганізацый, але і ініцыятыў, змогуць атрымаць фінансавую бюджэтную падтрымку з боку дзяржавы. А мы зможам больш канструктыўна разглядаць тыя праекты і рэалізоўваць іх на карысць грамадства.

***— Хутка Новы год, і дэпутаты заўжды становяцца непасрэднымі ўдзельнікамі дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», падчас якой прынята дапамагаць малазабяспечаным сем'ям, хворым дзецям і дзецям-сіротам, якія засталіся без апекі бацькоў.***

— Клопат пра дзяцей, нашу будучыню, — адзін з абавязкаў кожнага дэпутата. Мы не толькі ўдзельнічаем у рэспубліканскай акцыі, але прапануем і свае. Упершыню ў 2021 годзе дэпутацкім корпусам аб'яўлена дабрачынная акцыя «Калядная мара», у рамках якой дэпутаты вобласці выконвалі жаданні дзяцей са шматдзетных сем'яў, якія наведваюць цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання. У 2022 працягваем добрую традыцыю ў новым фармаце. У мэтах папулярызацыі дзейнасці дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў Магілёўскай вобласці, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і Маладзёжнага парламента, актыўна выкарыстоўваюцца сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку галоўная парламенцкая газета «Звязда». З мінулага года дэпутацкія старонкі з'явіліся ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм». Гэта яшчэ адзін канал, па якім народныя выбраннікі маюць зносіны з насельніцтвам, дзе іх выбаршчыкі даносяць свае ідэі і прапановы па вырашэнні мясцовых праблем.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.**

# МАРШРУТ ПАТРЫЁТАЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Таксама распрацаваны крытэрыі адбору важатых з ліку педагагічных работнікаў, якія маюць профільную педагагічную вышэйшую адукацыю і стаж педработы не менш як 3 гады. Ірына Старавойтава заўважыла, што перавага будзе аддадзена педагогам выхаваўча-аздараўленчых устаноў, якія бралі ўдзел у абласных і рэспубліканскіх патрыятычных конкурсах і акцыях.

Першы намеснік міністра падкрэсліла, што праграма знаходжання дзяцей у беларускіх гарадах у 2022 годзе атрымала добрыя водгукі ад удзельнікаў і арганізатараў праекта, таму прапануецца канцэптуальна схему руху «Цягніка Памяці» па тэрыторыі Беларусі не мяняць. Разам з тым, заўважыла яна, трэба больш прадумана падысці да распрацоўкі праграмы знаходжання з улікам знакавых месцаў рэгіёна, горадаўтваральных арганізацый і прадпрыемстваў, а таксама інтарэсаў дзяцей. Мяркуецца, маршрут па беларускай тэрыторыі будзе пралягаць праз Брэст, Гродна, Гомель, Жлобін, Магілёў, Мінск. А ў Расіі ўдзельнікі праекта наведаюць Маскву, Санкт-Пецярбург, Ніжні Ноўгарад, Уфу, Самару, Валгаград і Курск.

Міністэрства адукацыі распрацавала і адправіла ў органы кіравання адукацыяй палажэнне аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу «Я — патрыёт сваёй краіны», якое рэгламентуе парадак адбору навучэнцаў для ўдзелу ў праекце ў 2023 годзе. Конкурс прадугледжвае тры этапы. Першы этап конкурснага адбору завершыць да канца года. Другі і трэці туры пройдуць у студзені і лютым.

## Рэгіёны ўключыліся ў працэс падрыхтоўкі

Таксама ўдзельнікамі пасяджэння сталі намеснікі старшынь аблвыканкамаў, якія расказалі аб інтэрактыўных акцыях, распрацаваных да рэспубліканскага конкурсу «Я — патрыёт сваёй краіны». Акрамя таго, быў выказаны шэраг прапаноў. Так, **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір БЕЛАУС** прапанаваў вызначыць слоган, які б спалучаў моладзь, пераемнасць пакаленняў, гісторыю і культуру краін-удзельніц:

— Таксама прапаную пашырыць канцэпцыю праекта: прадугледзець не толькі сустрэчы з аўтарытэтнымі людзьмі, наведванне памятных месцаў і славутасцяў, але і наведванне ўстаноў адукацыі, горадаўтваральных прадпрыемстваў.

Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Пранюк канстатаваў, што дзякуючы фотавыстаўкам, прысвечаным «Цягніку Памяці», амаль усе школьнікі даведаліся шмат новай інфармацыі. Прапанова зладзіць экскурсіі для ўдзельнікаў праекта ў Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» і на Беларускі аўтамабільны завод паступіла ад намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама Івана Маркевіча.

У сваю чаргу, Віктар Лісковіч адзначыў, што ўнесеныя прапановы будуць улічаны, але перагружаць праграму праекта не трэба:

— У дзяцей павінен быць час для дыялогу і разважанняў. І ў той жа час трэба так разнастаіць мерапрыемствы, каб яны не былі аднатыпнымі ў кожным з рэгіёнаў: у выніку ва ўдзельнікаў павінна скласціся цэласная карціна нашай краіны, — рэзюмаваў Віктар Лісковіч.

**Арына КАРПОВІЧ.**

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# КАЛІ ДОМ БЕЗ ГАСПАДАРА...

## Як улады Гродзенскай вобласці вызначылі стратэгію работы з аварыйнымі і закінутымі дамамі

**ПАДЫХОД да праблемы пустуючых дамоў з кожным годам становіцца ўсё больш радыкальным. Значныя паўнамоцтвы па парадкаванні такой маёмасцю вызначаны ва Указе № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустуючымі дамамі», які ўступіў у дзеянне напрыканцы верасня мінулага года. Згодна з ім, кожны сельскі Савет да лютага будучага года павінен сфарміраваць поўную базу пустуючых дамоў. Усе звесткі ўвойдуць у адзіны дзяржаўны інфармацыйны рэсурс, дзе гэта маёмасць будзе прапанавана ў адкрытым доступе. На пасяджэнні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў ішла гаворка аб прымяненні на практыцы нарматыўных дакументаў і ўдасканаленні работы ў гэтым кірунку. Сітуацыю з пустуючымі жылымі дамамі, у прыватнасці іх своечасовым зносам, прааналізавалі і ў КДК Гродзенскай вобласці.**

### «Патрэбен правільны падыход»

Апошнім часам тэма пустуючых дамоў гучыць даволі часта ў розных галінах улады. Літаральна днямі ў Гродзенскім аблвыканкаме прайшла нарада, на якой разглядалася гэта пытанне ў кантэксце навядзення парадку на зямлі. Да вырашэння праблем павінен больш актыўна далучыцца і дэпутацкі корпус. Па словах **старшыні абласнога Савета дэпутатаў Алены ПАСЮТЫ,** трэба наладзіць міжведамаснае ўзаемадзеянне па навядзенні парадку на зямлі.

— Мы падключылі сельскія Саветы, стараст, рэалізуем праекты па добраўпарадкаванні, аднак патрабуюцца сур'ёзныя рабочыя ўкладанні і з боку людзей, якія адказваюць за канкрэтныя пытанні, — зазначыла кіраўнік дэпутацкага корпуса вобласці.

Пытанні па ўдасканаленні работы з пустуючымі дамамі былі абмеркаваныя на нарадзе ў абласным Савеце дэпутатаў. У прыватнасці, акцэнт зроблены на тлумачэнні Указа Прэзідэнта № 116.

— Указ дазваляе нам навесці парадак на зямлі, гэта значыць, падысці да гэтага пытання па-гаспадарску. Штосьці прыбраць, трухлявае знесці, лепшыя дамы прадаць. Для гэтага ўсё ёсць: заканадаўчая база, выбудаваныя алгарытмы дзеянняў на ўзроўні вобласці і раёнаў, выдзяляюцца сродкі, — падкрэсліла Алена Пасюта. — Ад прадстаўнікоў улады патрабуюцца правільны падыход і адказныя адносіны.

У Гродзенскай вобласці за апошнія 15 гадоў выяўлена амаль чатыры тысячы пустуючых дамоў. А ўжо сёлета на 1 кастрычніка ў такім рэестры дадалося 752. На снежань запланаваны знос больш чым 40 старых аварыйных жылых дамоў, што складае амаль 16 % агульнай колькасці «аварыек».

### Удасканаліць работу на месцах

Нарада стала свайго роду лікбезам для раённых Саветаў дэпутатаў: як працаваць з пустуючымі дамамі, як іх правільна ўтылізоўваць, як знайсці гаспадароў для больш прыдатных жыллёвых пабудоў. Падчас нарады быў зроблены акцэнт на прававыя аспекты



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

ўказа — менавіта на тыя нормы, якія даюць больш падстаў для вырашэння лёсу закінутых гаспадарамі хат.

Як нагадала **начальнік упраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама Наталля ГУЛІМАВА,** Указ № 116 значна спрашчае парадак адчужэння жылых дамоў у сельскай мясцовасці, якія эксплуатаваліся да мая 2003 года. Яны могуць адчужацца без наяўнасці праваўстанаўляльных дакументаў на іх. Дастаткова падпісаць дагавор куплі-продажу паміж прадаўцом і пакупніком і зарэгістраваць яго ў адпаведным мясцовым органе выканаўчай улады. Другі важны аспект датычыцца стварэння ўмоў для ўцягвання ў абарот жылых дамоў, якія пустуюць тры гады ці больш і знаходзяцца ў аварыйным стане. Алгарытм дзеянняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў прапісаны ў пастанове Савета Міністраў, прынятай у рамках указа.

— У кожным выканкаме створана спецыяльная камісія, якая праводзіць абследаванне не менш як два разы на год. Таксама імі вядзецца работа па пошуку ўласніка жылога памяшкання. Часта зрабіць гэта складана, бо ён не пражывае ў дадзенай мясцовасці ці наогул з'ехаў за межы краіны. Гэта зацягвае працэс, — зазначае Наталля Гулімава.

Калі ж уласніка адшукалі, ён атрымлівае паведамленне, што на працягу года павінен прывесці дом у належны стан. Калі гэтага не адбываецца, дом прызнаецца пустуючым, падаецца заява ў суд аб прызнанні яго безгаспадарчым. Пасля судовага вердыкту райвыканкам прымае рашэнне — альбо зносіць, альбо прадаць, ці пакінуць ва ўласнасці сельскага Савета.

Сёлета ў рэгіёне знесена каля 140 дамоў, 37 прададзена і 66 пакінута ва ўласнасці мясцовых органаў улады.

### Будзе агульны рэестр

Згодна з указам, кожны сельскі Савет павінен за гэты год сфарміраваць рэестр пустуючых дамоў. Гэтыя даныя затым увойдуць у агульную базу адзінага дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу, дзе ў адкрытым доступе будзе выстаўлена гэта маёмасць. Там будзе акумулявацца інфармацыя ад выканкамаў у рэжыме рэальнага часу па меры паступлення такіх аб'ектаў на ўлік. Чалавек у любым месцы краіны зможа ўбачыць спіс дамоў і пры жаданні набыць такі пустуючы дом. Увайсці ў такую базу можна будзе з лютага 2023 года.

### Як ацэньваюць такі рэестр мясцовыя ўлады і як яго фарміруюць?

На думку **старшыні Азерніцкага сельвыканкама Слонімскага раёна Ганны ПЯЦЬКО,** гэта мерапрыемства накіравана на ўдасканаленне работы с пустуючымі дамамі. Бо ў ім будуць звесткі па ўсіх дамах, якія маюць статус пустуючых. Напрыклад, на тэрыторыі Азерніцкага сельсавета такіх дамоў каля 200.

— На сённяшні дзень мы правялі інвентарызацыю чатырох населеных пунктаў — прайшлі вёскі да апошняй хаты, запісалі характарыстыкі дамоў, памеры, што як размешчана, якія ёсць пабудовы, з якіх яны будаўнічых матэрыялаў. Гэта вялікая работа, — канстатуе старшыня сельвыканкама.

На яе думку, нарматыўных дакументаў у гэтай справе дастаткова, але ёсць пэўныя складанасці з-за патэнцыйных нашчадкаў, многія з якіх знаходзяцца за межамі Беларусі. Бывае, што дом амаль разvalены, але яго складана знесці менавіта з-за цяжкасцяў у пошуку законнага ўласніка. Між тым ёсць вёскі, дзе з 80 дамоў 60 пакінутыя.

— Наш сельсавет аддалены ад горада, тут не асабліва прывабныя месцы для турызму, няма лесу і водных аб'ектаў. Таму мала ахвотных набыць дамы. Найбольш карыстаецца попытам нерухомасць у Вялікай Кракотцы. У нас там мужчынскі манастыр. Маёмасць тут добра цэніцца. Дагледжаныя дамы каштуюць ад 6 тысяч і вышэй, — расказвае Ганна Пяцько.

Вядома, у сельсавеце зацікаўлены ў тым, каб дамы не пуставалі. Імкнуцца іх прадаць з той мэтай, каб новы гаспадар адрамантаваў і навёў парадак, а не проста купіў, штосьці вывез і кінуў. Калі ж дамы старыя, трухлявыя, іх разбіраюць. У асноўным гэту работу праводзіць мясцовая сельгаспадарка. Штосьці ідзе на дровы, а цэментныя рэшткі, стары шыфер вывозяць на палігон адходаў.

— У гэтым квартале мы выканалі работы па зносе чатырох дамоў — адразу як атрымалі сродкі. Дамы ў розных вёсках, у тым ліку і ў аграгарадку Азерніца. Гэта плановыя тэрміны. Сумесна з раённай камісіяй правялі агляды дамоў, склалі акты яшчэ па дваццаці, каб прызнаць іх пустуючымі. Будзем прымаць рашэнні — штосьці зносіць, штосьці выстаўляць на продаж, — растлумачыла кіраўнік сельсавета.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

### Парадак наведзены не ўсюды

У рэгіёне ход работ па навядзенні парадку з пустуючымі дамамі і своечасовым уцягванні зямель у севазварот кантралюе КДК Гродзенскай вобласці. У 2022 годзе інспекцыя праведзена ў дзявяці раёнах. Вынікі кантрольных мерапрыемстваў сведчаць, што ў некаторых раёнах пытанне з пустуючымі дамамі вырашаецца марудна ці толькі «на паперы».

Напрыклад, у Ваўкавыскім раёне не знесены два дамы, рашэнні па зносе якіх прыняты яшчэ ў 2019 годзе. У Гродзенскім раёне аналагічная гісторыя цягнецца ажно з 2015 года, гаворка ідзе пра дом у вёсцы Падліпкі. Такая ж сітуацыя з пустуючым домам у Асочніках.

> Указ дазваляе навесці парадак на зямлі, гэта значыць, падысці да пытання па-гаспадарску. Штосьці прыбраць, трухлявае знесці, лепшыя дамы прадаць. Для гэтага ўсё ёсць: заканадаўчая база, выбудаваныя алгарытмы дзеянняў на ўзроўні вобласці і раёнаў.

А вось у Зэльвенскім раёне выяўлена 19 старых дамоў, рашэнні па зносе якіх прымаліся ад двух да шасці гадоў таму. У КДК звернута ўвага і на недасканалую ў дадзеным кірунку работу ўладаў у Воранаўскім раёне. Тут у чарзе на знос знаходзіцца 10 хат, і такі спіс павялічваецца. Наяўнасць пустуючых дамоў, якія не знесены ў тэрмін, устаноўлена ў Лідскім, Свіслацкім і Шчучынскім раёнах.

У некаторых выпадках мясцовыя ўлады бюракратычна падыходзяць да выканання сваіх рашэнняў, у прыватнасці, па продажы старых дамоў. З такой сітуацыяй сутыкнуліся кантралёры ў Слонімскім раёне. Тут з-за валакіты засталося непрададзенымі некалькі дамоў у вёсках. У гэтым жа раёне дзевяць участкаў пасля зносу дамоў не ўцягнуты ў севазварот і параслі бур'янам. Па ўсіх канкрэтных выпадках кантралёрамі выстаўлены патрабаванні на адрас райвыканкамаў аб прыняцці дзейсных мер па навядзенні парадку з пустуючымі дамамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# АД «КАРТОХІНГУ» ДА «МОТАЛЬСКІХ ПРЫСМАКАЎ»

## Сельсавет з Іванаўскага раёна наладзіў партнёрскія адносіны з муніцыпальным утварэннем з Сібіры

**У ходзе работы сёмага пасяджэння рабочай групы па супрацоўніцтве Іркуцкай вобласці і Рэспублікі Беларусь, якое прайшло на мінулым тыдні ў Іркуцку, было падпісана пагадненне аб устанаўленні партнёрскіх адносін паміж муніцыпальным утварэннем Тургенеўка Баяндаеўскага раёна Іркуцкай вобласці і Мотальскім сельскім Саветам Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці.**

**Старшыня Мотальскага сельвыканкама Сяргей ПІЛІПОВІЧ** расказаў карэспандэнту «МС» пра сваю паездку ў Іркуцкую вобласць і падпісаныя дакументы. Паводле яго слоў, Тургенеўка — сваеасаблівая часцінка Беларусі ў далёкай Сібіры. Заснавалі вёску ў 1909 годзе беларускія перасяленцы. У ходзе так званай сталыпінскай рэформы некалі нашы землякі накіраваліся асвойваць дзікія таёжныя прасторы. Кожнай сям'і давалі прыкладна па гектары зямлі, якую трэба было шчодра паліць потым: спачатку высякалі лес, карчавалі пні, потым аралі зямлю. Па першым часе жылі ў зямлянках. Некаторыя не вытрымлівалі цяжкіх умоў і вярталіся. Заставаліся самыя моцныя духам і целам. За некалькі гадоў яны пабудавалі паселішча з трывалымі, грунтоўнымі дамамі, якія стаяць да гэтай пары. Сёння ў іх жывуць нашчадкі першых пасяленцаў.



Сяргей ПІЛІПОВІЧ і Віктар СІНКЕВІЧ падчас падпісання пратакола па выніках сустрэчы.

У 1930 годзе ў Тургенеўцы ўтварыўся калгас імя Чапаева, хутка ён стаў грымець на ўсю краіну. Тут ставілі рэкорды па надоях малака і ўраджайнасці сельгаскультур. У 1970-я гады калгас быў мільянерам, а яго работнікі актыўна куплялі машыны, чым выдзяляліся з усяе акругі. Так што кіраўнік тамтэйшага музея ніколі не забывае падкрэсліваць працавітасць як нацыянальную рысу беларусаў. Хоць чыстакроўных беларусаў тут фактычна не засталося, сем'і цяпер змешаныя, але жыхары Тургенеўкі не забываюць свае карані. У школе працуе факультатыў па вывучэнні беларускай мовы. У Доме культуры ёсць два творчыя калектывы — народны хор «Варэнічкі» і дзіцячы ансамбль «Ручнічок». Песні яны пяюць беларускія. І святы ў Тургенеўцы адзначаюць нашы — Купалле, Дажынкі, Гуканне вясны. Увосень тут праводзяць вясёлыя спаборніцтвы па копцы бульбы — «картохінг». Чэмпіянат складаецца з трох частак: спачатку капаюць бульбу навыперадкі, потым цягаюць мяхі на хуткасць, а затым кідаюць бульбіны на адлегласць. Фестываль, які таксама мае адгалосак беларускасці, збірае шмат гасцей. Тут кожная сям'я саджае бульбу. І нават прозвішча кіраўніка пасялення Віктара Сінкевіча сведчыць аб беларускіх каранях.



Так выглядаюць дамы былых перасяленцаў.

— Шмат цікавага давялося ўбачыць у Тургенеўцы, якая знаходзіцца за 70 кіламетраў ад Байкала, — расказвае Сяргей Піліповіч. — Вельмі мяне ўразіла іх бібліятэка. Гэта сапраўдны культурны цэнтр, аснашчаны ўсім неабходным для чытання і атрымання інфармацыі. Тут багаты кніжны фонд, камп'ютары, мэбля — усё ўладкавана так, што зручна і дзецям, і дарослым. Бібліятэка праводзіць шмат мерапрыемстваў. Тут можна даведацца і пра гісторыю пасялення, і пра яго людзей.

Паводле слоў Сяргея Мікалаевіча, у Мотале з Тургенеўкай агульнае тое, што абедзве адміністрацыйныя адзінкі складаюцца з аднаго населенага пункта, праўда, Моталь у некалькі разоў большы па колькасці насельніцтва. А яшчэ і ў расійскім, і ў беларускім сяле ёсць цікавыя музеі, праходзяць фестывалі і святы. Вось і «Мотальскія прысмакі», якія пройдуць у жніўні 2023 года, запрасілі сяброў з Тургенеўкі.

Сяргей Піліповіч расказаў, што з кіраўніцтвам пасялення накрэслілі праграму супрацоўніцтва: «Найперш гутарка ідзе аб інфармацыйных абменах у сферы эканомікі ды культуры. Падчас сустрэчы падпісалі пратакол аб намерах, а далей будзем напаўняць супрацоўніцтва канкрэтнымі напрацоўкамі і мерапрыемствамі. Нам ёсць чаму павучыцца адно ў аднаго ў плане арганізацыі самакіравання».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Фота дадзена Мотальскім сельскім Саветам.*



З самадзейным калектывам «Варэнічкі».

« У Мотале з Тургенеўкай агульнае тое, што абедзве адміністрацыйныя адзінкі складаюцца з аднаго населенага пункта, праўда, Моталь у некалькі разоў большы па колькасці насельніцтва. А яшчэ і ў расійскім, і ў беларускім сяле ёсць цікавыя музеі, праходзяць фестывалі і святы. Вось і на «Мотальскія прысмакі», якія пройдуць у жніўні 2023 года, запрасілі сяброў з Тургенеўкі.



У сельскай бібліятэцы Тургенеўкі.

Як ужо гаварылася, падпісанне дакументаў адбылося ў рамках сёмага пасяджэння рабочай групы па супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь і Іркуцкай вобласці. Асноўным пытаннем стала абмеркаванне плана мерапрыемстваў па рэалізацыі пагаднення паміж урадамі Іркуцкай вобласці і Беларусі аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным, гуманітарным супрацоўніцтве на 2023—2025 гады. Дакумент падпісалі **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** (як адказны за каардынацыю супрацоўніцтва краіны і расійскага рэгіёна) і **губернатар Іркуцкай вобласці Ігар КОБЗЕЎ.**

